ПРОЗА

# Віктар Праўдзін

# НЕПЕРАМОЖНЫ ЗЛОМ

*Раман-версія.*
*Заканчэнне. Пачатак у №11—12 за 2023 г., №1 і №5 за 2024 г.*



## ЧАСТКА ДРУГАЯ

## Час разбою і святасці

*1919 год*
*Дваццаць дзявятага красавіка,*
*аўторак (трохі больш за поўнач)*

Мінулым надвячоркам трынаццатая камера, у якой бацюшка Канстанцін некалькі апошніх дзён даволі спакойна вёў гутаркі з Іванам Завадскім, нечакана пачала напаўняцца. Вельмі хутка месца амаль не засталося, наперадзе была ноч, а спаць можна было толькі прыхінуўшыся спінай да сцяны, і то па чарзе. Камуніст Завадскі абурыўся, пачаў згадваць нормы квадратных метраў на чалавека ў царскім пастарунку, у выніку паскандаліў з начальнікам турмы Юргасам і апынуўся ў адзіночнай камеры. Завадскі працягваў грукаць у дзверы і цяпер патрабаваў, каб яго вярнулі назад ці перасялілі да яго бацюшку Канстанціна, што выклікала ў наглядчыкаў гучны здзеклівы рогат.

Бацюшку Канстанціна цяжка было нечым здзівіць, ды гэта ўдалося Аляксею Сакалову, настаяцелю праваслаўнай царквы з вёскі Язна. Убачыў яго іерэй, пазнаў і кінуўся з абдымкамі, як да роднага брата. Толькі Сакалоў у тлумным камерным надвячорку не адразу прызнаў у схуднелым, змучаным цяжкімі хваробамі, згорбленым сівым «дзядку» Канстанціна Жданава. Размова ні ў іх, ні ў іншых наноў заселеных чамусьці не клеілася. У арыштантаў узнікала адчуванне, што цяжкая смуродная камера да кожнага прыглядалася, вывучала. Недавер, які, здавалася, лунаў у паветры, перадаўся і сядзельцам. Яны зрэдку кідалі адзін на аднаго напружаныя позіркі. Было відавочна, што за турэмныя краты гэтыя арыштанты трапілі ўпершыню, і цяпер насцярожанасць для іх — адзіны сродак выжыць і пазбегнуць найгоршага.

Доўга прымерваліся арыштанты да новых абставінаў, ды ў нейкі момант усё ж пачалі перакідвацца, на першы пагляд, быццам бы пустымі фразамі. Каб распачаць гаворку, у кожнага само па сабе ўзнікала пытанне: «За што?..» Адказ гучаў стрыманы: «Ні за што… Людзі абгаварылі…» Далей — больш. Патроху амаль усе разгаварыліся, і той, хто назваўся Вярцінскім, смела сказаў: «Цяпер данос і нагавор — зброя дзісенскіх уладароў!..» Пасля гэтых слоў сядзельцы зноў надоўга замаўчалі, відавочна, спужаліся смеласці гэтага чалавека, у постаці якога, і асабліва ў голасе, адчуваліся смеласць, самавітасць, упэўненасць.

Нечакана загаварыў чалавек, што некалькі гадзін моўчкі сядзеў каля сцяны, абхапіўшы галаву далонямі, і нешта незразумелае мармытаў сабе пад нос.

— Да людскіх нагавораў мы з жонкай прывыклі… — прамовіў ён і абвёў прысутных нейкімі як замыленымі, бялёсымі зрэнкамі. Спыніў позірк пад столлю, на адзіным квадратным акенцы, у якім бачыўся маленькі кавалак неба. — Божа, памажы!.. — адчайна выкрыкнуў чалавек. — Нас з жонкай абвінавацілі, быццам нашы сыны-афіцэры ваююць на баку белагвардзейцаў!.. Ці ж можна ў гэткае паверыць, калі ў нас ніколі не было сыноў?! Змоладу мы хацелі, мы вельмі хацелі, каб у нас сыны былі!.. Ды Бог не даў!.. Арыштавалі, абвінавацілі, і ніхто слухаць не хоча, стаяць на сваім: «У Чуро сыны ёсць, і яны — белагвардзейцы!..» Дзе шукаць праўду?.. Мяркую, нас у кучу сабралі і, пэўна, у Віцебск павязуць. Спадзяюся, там змогуць ва ўсім разабрацца…

Бацюшка Канстанцін толькі ўзняўся, каб падысці да Чуро і паспрабаваць супакоіць, ды ў гэты момант у калідоры гучна затупалі, хтосьці грукнуў у дзверы каваным ботам, пэўна, каб разбудзіць сядзельцаў. Нервова скрыгатнуў у замку ключ, пагрозліва рыпнулі дзверы, і ў камеру ўваліліся некалькі чалавек.

Сярод іх быў начальнік турмы Юргас, намеснік начальніка міліцыі Баброўскі, які назваў сябе і важна абазначыў пасаду. Ён выцягнуў з кішэні напалам складзеную запіску, разгарнуў, строга аб'явіў:

— Жданаў, Сакалоў, Корсак, Чуро, Вярцінскі, Лазараў і Завадскі — на выхад…

— Лазараў і Завадскі ў іншых камерах, — удакладніў Юргас.

— Каго назваў, выводзім на вуліцу, Лазарава і Завадскага таксама трэба даставіць.

— Нас пераводзяць у Віцебск?.. — збіраючы свае рэчы, запытаўся Чуро і выцер рукавом заплаканыя вочы.

— Так, у Віцебск… Рэчы свае не бярыце, — незадаволена буркнуў Баброўскі, дадаў: — Заўтра давязём.

— Ніколі гэткага не было, каб назаўтра рэчы прывозілі!.. — насцярожыўся Вярцінскі. — Мы і самі.

— Загадана выходзіць, значыць, выходзім!.. — злосна штурхнуў Вярцінскага незнаёмы чалавек, апрануты напалову ў вайсковае, і густа вылаяўся матам. Камера імгненна напоўнілася сівушным перагарам, а ён ужо штурхаў усіх, хто трапляў пад руку, на выхад, да дзвярэй.

— Мяне не называлі! — напята выкрыкнуў аптэкар Нэйштат.

— І мяне таксама, — схаваўся далей, у самы куток камеры, Гайлевіч.

— І я не названы!.. — у адзін голас ускрыкнулі Мікуцкі, Аколаў і бухгалтар Куперман.

— Хоць апранучца можна? — запытаўся Корсак. Ён усё зразумеў і моўчкі пачаў раздаваць свае рэчы тым, хто заставаўся ў камеры.

— Апранучца можаце, — паблажліва дазволіў Баброўскі. Памаўчаў, дадаў: — На гэта ў вас тры хвіліны.

— Ніякага парадку ў турме!.. — пагардліва вышукваючы, каму б яшчэ паддаць кухталёў, ускрыкнуў той жа нецвярозы, наблізіўся да Юргаса, зласліва прасіпеў: — З першага мая тут будзе ўстаноўлены жалезны парадак!

— Валынец, Стэфан, ты на што намякаеш? — перапытаў Юргас і выставіў рукі, каб п'яны не набліжаўся і не дыхаў на яго перагарам.

— Хутка даведаешся, — праз тлустыя вусны з прыліплымі да іх хлебнымі крошкамі, а можа, і што іншае зачапілася за куткі рота, прасіпеў Валынец, хістануўся, мог і паваліцца, ды Баброўскі падтрымаў.

— Ідзі, чакай на вуліцы, — Баброўскі падштурхнуў памочніка да дзвярэй, на арыштантаў прыкрыкнуў: — Хутчэй апранайцеся, і выходзім!

Па тым, як Баброўскі і канваіры ўваліліся ў камеру, па разбэшчаных паводзінах п'янага Валынца іерэй імгненна зразумеў, да чаго трэба рыхтавацца. І ўсё ж надзея заставалася: магчыма, іх насамрэч павязуць у Віцебск… Яго першага пад аховай вывелі на вуліцу.

Сырая слотная ноч цяжкім удушлівым смогам бы праглынула бацюшку Канстанціна, як толькі ён сышоў з турэмнага ганка і зрабіў некалькі крокаў па яшчэ добра не прасохлай з зімы зямлі. Уздыхнуў на поўныя грудзі, і чамусьці гэтая стоеная тупая ноч падалася сапраўднай бандыцкай хаўрусніцай. Нават уявіў, як непраглядная цемень укрывае злодзея ад старонніх вачэй і змывае сляды нядаўна зладзейства. Незаўважна для сябе зрабіў яшчэ некалькі крокаў, і тут жа ў спіну — грозны вокрык:

— Стой, страляць буду!

Хтосьці нябачны, укрыты начной слотай, бы падзадорыў і сябе, і таго, хто першы абазначыў намер «страляць», спакойна прамовіў:

— Ты, поп, яго не слухай, бяжы… — Шчоўкнуў затвор вінтоўкі. — Ты ні кропелькі не прайграеш, наадварот, застанешся ў выйгрышы…

— Добрай справе і мы паможам…

Пачуўся здзеклівы рогат нябачнай, калі меркаваць па агеньчыках папярос, шматлікай каманды.

Ад гэтага зладзейскага рогату зрабілася млосна, здавалася, халодныя шчупальцы пачалі мацаць ступні ног, потым вышэй, праз секунду яны халадзілі ўжо ўсе ногі,ігольчатымі стрэмкамі прашчупвалі грудзі, падбіраліся да сэрца, ціснулі на скроні… Нечакана пачуліся ціхія гукі азбукі Морзэ: ці-ці-ці та-та-та ці-ці-ці… Гэтая манатонная незвычайная музыка кропак-працяжнікаў у нейкі момант стала блізкай і зразумелай іерэю, ды няведама адкуль узніклы настойлівы шэпт пачаў забіваць «марзянку»:

«…Бяжы — і канец мучэнням… Бяжы — і выжывеш… Бяжы — і стралкі прамажуць.. Ты толькі бяжы! — падбадзёрваў упарты шэпт. — Бяжы, я адвяду бяду… У гэтых алкаголікаў рукі трасуцца… Яны абавязкова прамажуць… Бяжы, ты малады, у цябе сынок, табе жыць ды жыць… Бяжы!..»

«Мо тое і праўда?..» — толькі прамільгнула ў бацюшкі Канстанціна бляклая спакуслівая думка — і ў нагах адразу з'явілася незразумелая лёгкасць, цела само па сабе наструнілася і было гатова кінуцца прэч, як мага далей ад гэтага пагібельнага месца… Ды раптам сэрца захвалявалася, і трошкі вышэй ад яго, каля саска, пацяплела, здавалася, вось-вось з'явіцца тое жаданае святое цяпло, якога бацюшка заўсёды чакае. Яно з'яўлялася не па жаданні, а само па сабе, часцей у царкве, падчас святой літургіі, і тады бацюшка Канстанцін разумеў, што Бог побач, гэта Яму вернікі спяваюць псалмы і прысвячаюць святыя евангельскія маленні…

— Божа, падкажы, што мне рабіць? — прашаптаў іерэй, з цяжкасцю перамагаючы заганнае жаданне падпарадкавацца таму, хто ўжо ласкава нашэптвае аб мазілах з вінтоўкамі. Адказу не было… — Божа, змілуйся… Духам сілы Тваёй умацуй мяне… — Бацюшка Канстанцін прасіў аб дапамозе, але нішто больш не шавяльнулася ў грудзях.

«…Бяжы — і ні пра што не думай… Пабяжыш — і я ва ўсім буду табе дапамагаць…» — настойліва, як загад, гучаў голас, ды цяпер іерэй добра ведаў, хто яго спакушае.

Слёзы роспачы і жалю каціліся з вачэй, губы надрыўна шапталі: «Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх і загладзь усе беззаконні мае. Чыстае сэрца ўмацуй ува мне, Божа, і дух справядлівы аднаві ўва мне. Не адкінь мяне ад аблічча Твайго і Духа Твайго Святога не адбірай у мяне. Вярні мне радасць збавення Твайго, і Духам Уладным мяне падтрымай» (Пс. 50: 11—14).

У нейкі момант бацюшка Канстанцін пачуў голас таткі, бацюшкі Дзмітрыя: «Слухай сэрца сваё!.. Не чакай і не шукай дзівосаў, не спадзявайся на парады, асабліва незнаёмцаў… Успомні тыя журботныя святыя ночы, што правёў у малітвах і таксама прасіў у Госпада нашага, Ісуса Хрыста, падказкі, якім шляхам ісці ў жыццё… Ведаю, ты не пачуў ад Яго падказкі і сам прыняў рашэнне: прысвяціць жыццё служэнню Богу!.. Сёння той самы выпадак, калі рашэнне ты павінен прыняць толькі сам!.. І ўсё ж падказка ёсць!.. Калі прымеш правільнае рашэнне, унукі, праўнукі, прапраўнукі тых, хто сёння навёў на цябе зброю, будуць стаяць у царкве на каленях і маліць Госпада нашага Ісуса Хрыста аб дараванні грахоў сваім продкам…»

— Так, татка, так!.. Я служу Госпаду!.. — шапталі і шапталі скусаныя да крыві вусны. — Служыў і буду служыць Госпаду!.. Да самага канца!.. — гучна, упэўнена сказаў бацюшка Канстанцін і адразу адчуў, як загарэлася тое чаканае і жаданае цяпло над сэрцам.

— Што ты, поп, там шэпчаш? — Валынец падбег да бацюшкі Канстанціна, штурхнуў у плячо, угледзеў шчаслівую ўсмешку на твары іерэя і разгубіўся, ды толькі на секунду. Ён яшчэ раз балюча ўдарыў бацюшку Канстанціна, азірнуўся на Баброўскага, успомніў, што да пары не павінен гаварыць, куды павядуць арыштантаў, прасіпеў: — Табе, п'яўка на маім целе, смешна?!. Ну, пачакай!.. Праз паўгадзінкі прыпомню!.. Крывавай юшкай захлынешся!.. Ваўком завыеш!.. Прасіць будзеш, каб дастрэліў!..

— І табе, Валынец, і дзецям тваім Божай ласкі, — сказаў бацюшка Канстанцін, па звычцы ўзняў руку і перахрысціў яго.

— Я табе пакажу ласку!.. — з пенай каля рота вызверыўся Валынец і з усёй сілы адштурхнуў ад сябе іерэя. Потым спалохана азірнуўся, каб зразумець, ці бачыў хто, што яго поп перахрысціў, і з яшчэ большай злосцю прасіпеў: — Я цябе нагайкай гэтак аблашчу, што на месцы сканаеш, я цябе…

Грозны голас Баброўскага ацверазіў крыклівага памочніка:

— Валынец, ці не рана прымерваеш на сябе картуз начальніка турмы?.. Ідзі, дапамагай…

— Бягу, таварыш Баброўскі, бягу… Гэта я так… Каб поп ведаў і паважаў нас, начальнікаў…

Яшчэ трохі мінула часу, і арыштантаў пастроілі ў калону па два, свяшчэннаслужыцелі аказаліся побач, плячо ў плячо. Прывялі дзвюх жанчын. Адна кінулася да Чуро, і ён абняў жонку, прытуліў да сябе, нешта супакойліва зашаптаў… Другая, як бацюшка Канстанцін зразумеў, была сястрой Лазарава. Яна

прыхінулася да брата і ціха, напаўголасу, заплакала. Завадскага, трымаючы пад рукі, апошнім спусцілі з нязручных высакаватых прыступак.

— Гэты біцца кінуўся — ну, і атрымаў… па рэбрах… — цяжка сапучы, з вінаватымі ноткамі ў голасе, гукнуў з ганка адзін з канвіраў.

— Малайцы, цяпер ён ціхі будзе, — пахваліў іх Валынец.

Баброўскі папрасіў Юргаса пераправерыць арыштантаў у калоне, і начальнік турмы тут жа адрапартаваў, што сядзельцы выведзены для канваіравання ў адпаведнасці з заяўкай выканкама. Баброўскі кіўнуў памочніку, маўляў, камандуй, і Валынец крыкнуў: «Калона, прама, шагам марш!» Калона скаланулася, хістанулася, і сядзельцы няспешна ўразнабой зашморгалі падэшвамі па золкай вясновай зямлі.

Нейкі час ішлі моўчкі.

— Айцец Канстанцін таксама ведае, што нас вядуць на расстрэл, а не пераводзяць у Віцебск? — шэптам запытаўся Аляксей Сакалоў.

— Ні кропелькі ў тым не сумняваўся і не сумняваюся, — адказаў бацюшка Канстанцін.

— І вы гэтак спакойна пра смерць?

— Кажу, бо нічога змяніць не магу.

— Прапаную аб'яднацца і каля першых кустоў…

— Адставіць размовы, — ціха сказаў Баброўскі. Ён вельмі хацеў, каб калона арыштантаў як мага даўжэй заставалася нікім не ўбачанай і не пачутай. Толькі гэтага дабіцца не ўдалося, галасы канвіраў з кожнай хвілінай мацнелі, чуліся смех, брудная лаянка...

— У мяне саспеў план… Я прапаную ўцёкі, — прашаптаў Сакалоў. — Мясцовасць ведаю… Хутка пачнуцца хмызнякі, і калі мы ўдвух шуснем у розныя бакі... Пэўна ж, бачылі калісь, як гэта робяць зайцы?... — І, не чакаючы адказу, дадаў: — Палова з канвіраў, калі меркаваць па гамане, ужо нецвярозыя, а другая палова хутка ўвойдзе ў норму першых… Ды і чорная, шчыльная ноч нам стане памочніцай. Што скажаце?.. Згода?..

— Аляксей, прага да жыцця дасць вам сілу і моц!.. Толькі што будзе потым, пасля ўцёкаў? На другі ці трэці дзень зловяць і давядуць пачатае да канца…

— Змяню месца жыхарства, магчыма, і прозвішча… Як вам такі варыянт?..

— Рызыкуйце, гэта ваша рашэнне і ваш выбар, — спакойна прамовіў бацюшка Канстанцін. — Мой выбар і маё цвёрдае рашэнне: **што Бог пашле, тое і буду цярпець...**

*Адзінаццатага чэрвеня,*
*серада*

«…Няма нічога таемнага, каб не стала яўным, ні схаванага, што не стала б вядомым і не выявілася» (Лк. 8: 17).

Старшыня судова-следчай камісіі пры Віленскім губернскім выканкаме таварыш Белік прыбыў з памочнікамі, атрадам чырвонаармейцаў, у Дзісну і адразу накіраваўся ў павятовы выканаўчы камітэт. Ён меў заданне: разабрацца у законнасці адклікання дзісенскага атрада з баявога фронту і перавышэнні паўнамоцтваў мясцовай уладай у кіраванні паветам.

Белік, прынцыповы законнік, адданы партыі камуніст, выглядаў гадоў на сорак, быў сярэдняга росту, хуткі ў рухах, кемлівы, смелы ў прыняцці і адстойванні сваіх рашэнняў, меў добрую юрыдычную адукацыю. Калі ён увайшоў у кабінет старшыні дзісенскага выканкама, Ляскоўскі, які чакаў «рэвізора», не адразу паверыў, што чалавек у вайсковым зношаным шынялі, у простай сал-

дацкай гімнасцёрцы, кірзавых ботах, будзёнаўцы на галаве і ёсць той самы губернскі судовы следчы высокага рангу. Старшыня так разгубіўся, што забыў прапанаваць следчаму загадзя падрыхтаваны сняданак, які, прыкрыты ручніком, туліўся зводдаль, каля грубкі, на нізкаватым старадаўнім століку з адмысловымі ножкамі. І стол, і шыкоўны буржуйскі посуд дзеля гэтай сустрэчы рэквізаваў Александровіч у былога панскага ўпраўляючага.

Губернскі следчы павітаўся, прад’явіў мандат і адразу перайшоў да справы: папрасіў паказаць загады, распараджэнні, пратаколы партыйных і рэўкамаўскіх сходаў за красавік — май, а таксама справы асуджаных да найвышэйшай меры пакарання ў ноч на дваццаць дзявятага красавіка.

Белік гаварыў, а Ляскоўскі не мог адарваць вачэй ад яго шыняля. Учэпісты, разгарачаны позірк адэскага «Мыколы» цяпер пільна вывучаў крой шыняля, а думкі круціліся каля аднаго: «Што, калі і «рэвізор» аднаго са мной племені — карыслівага?..» Ляскоўскі ўважліва разглядваў швы, за якімі некалі і сам хаваў нарабаванае, а калі не знайшоў, за што зачапіцца, імгненна сябе супакоіў: «Мог не заўважыць... Калі шынель не распорваўся і не зашываўся, дык гэта яшчэ ні пра што... Магчымасцей узбагаціцца і надзейна схаваць кроўнае гэты губернскі прастачок мае многа больш, чым было ў мяне... Ды і навошта яму каштоўнасці з сабой цягаць?.. Як піць даць, недзе ёсць надзейнае месца, мо нат і за мяжой...»

Гэтыя ліпкія, цяжкія разважанні не адпускалі. Ляскоўскі машынальна даставаў з сейфа ўсё, што хацеў бачыць Белік, а ў вачах стаяў бацька Розы, які пры першай сустрэчы прыдзірліва разглядаў яго шынель. Стары кравец тады нават далонню па плячы правёў, пэўна, і швы не засталіся без яго ўвагі. Ляскоўскі толькі цяпер нечакана ўцяміў, што бацька Розы, як выключны спецыяліст у кравецтве, не мог не ўбачыць і не адчуць пад матэрыяй і нават у складках шыняля чужароднае цела. Калі гэта так, значыць, стары наўмысна скроіў яму скуранку і хітра падмяніў на шынель... Толькі ці ведала пра гэта Роза?.. Калі ведала, яна хаўрусніца ў крадзяжы, і каханне яе — пшык, прыдумка, гульня... А калі не ведала?.. Тады ўсё можна выправіць... Тады ён са скуры вылузнецца, каб зрабіць яе багатай... І ўсё жыццё будзе маўчаць... Ні кепскага слова, ні намёку не дазволіць сабе ў бок яе бацькі... Зрэшты, пасля бацькі ўсё дабро і так дастанецца адзінай дачцэ, яна ж спадкаемніца... Хай бы так і было!.. І мне клопату аніякага...Толькі б Роза нічога не ведала і мяне кахала...

— Што з вамі? — і раз, і два прагучаў голас Беліка, ды Ляскоўскі, заглыблены ў свае здагадкі і разважанні, на вокрык — аніякай увагі. Губернскі следчы заклапочана дакрануўся да яго пляча, і толькі пасля гэтага дзісенскі старшыня спахапіўся. — Мікалай Антонавіч, што з вамі? — каторы раз запытаўся Белік і лагодна дадаў: — Не ўспрымайце мой прыезд як нешта трагічнае... Мая задача — не караць, а дапамагчы выправіць дапушчаныя памылкі...

— Ці можна мне адлучыцца па важнай справе? — панура запытаўся Ляскоўскі, хоць яшчэ і сам не ведаў, што скажа ці зробіць, калі ўбачыць Розу? Не разумеў, як будзе выглядаць яго абвінавачванне ў крадзяжы, калі няма доказаў, і прайшло больш за месяц яго маўчання?

Увесь гэты час ён рабіў выгляд, што нічога катастрафічнага не здарылася, і яго агрэсіўнасць, звязаная з прапажай шыняля, — чыстай вады выпадковасць. Ён пераконваў Розу, што ў тую раніцу здалі нервы, віной — прывычка да халасцяцкага жыцця і прывязанасць да пэўных рэчаў. Шынель называў не інакш як сябрам, які ратаваў ад халадоў у самыя каварныя сцюжы. Першым часам Ляскоўскі спадзяваўся, што прапажа знойдзецца, ды пошук плёну не даў, хоць

Роза не губляла ўпэўненасці, што бацька і ўся яўрэйская суполка знойдуць шынель. Не знайшлі…

Сёння ўсё бачанае і чутае ў сям'і Розы за апошні месяц нечакана згадалася, зачапіла за жывое, і пакража ўбачылася рэальна спланаванай. Найперш успомнілася раптоўная хвароба бабы Цылі. Гэта стала галоўнай прычынай пераносу іх з Розай шлюбу да яе вылечвання. Калі Ляскоўскі зрэдку бачыў старую, яму пастаянна прыходзіла заклапочаная думка: «Ці ведае пра сваю цяжкую хваробу сама баба Цыля?..» Яна тэпала, як заўсёды, жыла ў сабе: хацела гаварыць — чула, не хацела — не чула. Часцей, чым звычайна, сварылася на кватаранта на незразумелай яму мове. Калі казаў пра гэта Розе, дзяўчына ў адказ пасміхалася: «Не звяртай увагі, у бабулі хвароба прагрэсіруе».

Цяпер, менавіта ў гэтую самую хвіліну, Ляскоўскаму нясцерпна захацелася ўбачыць нявесту. У душы расло, шырылася пачуццё безуцешнай трывогі, ён быў цвёрда перакананы, што павінен убачыць яе вочы, убачыць — і ўсё зразумець пра яе і пра сябе. Ён ціха прашаптаў:

— Таварыш Белік… Мне б адлучыцца… Ненадоўга…

Спрактыкаваны ў падобных акалічнасцях, Белік зусім па-іншаму расцаніў гэтую просьбу. Ён, каб не давялося потым прымаць меры да вышуку ўцекача, цвёрда прамовіў:

— Думаю, Мікалай Антонавіч, у вашых інтарэсах застацца і дапамагчы мне разабрацца ў паперах і пытаннях, што сталі прычынай маёй камандзіроўкі. Мяне цікавіць, як ужо казаў, не ўся дзейнасць дзісенскіх кіраўнікоў, а толькі прычына адклікання з Варапаева дзісенскага атрада і, безумоўна, расстрэл дваццаць дзявятага красавіка. Запытаецеся, чаму цікавіць менавіта расстрэл? Адкажу. Расстрэл — галоўная прычына хваляванняў мясцовага люду, а гэтыя хваляванні, па данясеннях армейскай разведкі, могуць перарасці ва ўзброенае паўстанне. Мы разам павінны знайсці мудрае рашэнне, якое дапаможа апярэдзіць кепскія наступствы. І яшчэ… — Белік зрабіў невялікую паўзу, але вачэй не адвёў. Яго пільны востры позірк працягваў вывучаць Ляскоўскага. — Ёсць меркаванне, што паўстанцы не самі па сабе, — трошкі цішэй сказаў Белік. — Яны могуць быць звязаны і кіравацца польскімі сакрэтнымі службамі. Так што застаньцеся, мы разам хутчэй ва ўсім разбярэмся, а ўжо тады за столікам вось тым шыкоўным і пасядзім. — Ён кіўнуў галавой у бок прыгатаванага сняданку, усміхнуўся і дадаў: — І сардэчна развітаемся…

— Я што, арыштаваны?.. — нарэшце Ляскоўскі ўцяміў сказанае Белікам.

— Не, сваёй уладай я пераводжу вас, партыйную арганізацыю і рэўкам, на ваеннае становішча. Што гэта азначае, спадзяюся, вы ведаеце.

— Мы і без вашага ўказання на вайне… — Ляскоўскі нядобра зыркнуў на следчага, падумаў і дадаў: — На мове вайскоўцаў гэта азначае, што ўводзіцца казарма.

— Правільна зразумелі, — павесялеў Белік. — Вы нейкі час павінны быць у полі майго зроку. Гэта ненадоўга, нешта мне падказвае, што ўправімся хутка, ды і маё начальства прасіла не вышукваць дробязей, усё ж вайна, кожны штык на ўліку.

Сказаўшы гэта, ён схітраваў, наадварот, прамым тэкстам было загадана правесці «паказальную лупцоўку», ды так, каб прыкладу Дзісны надоўга хапіла ўсім мясцовым уладам рэспублікі. Некаторыя з іх адчулі сябе не менш як панамі і без агляду на «цэнтр» пачалі жыць і кіраваць паводле прынцыпу: як левая нага хоча, так і будзе. Скаргі на самадура Маляўку паспелі дайсці і да Віцебска, і да Мінска, і да Вільні.





**Анатоль Зэкаў**

# У ХАТУ БАЦЬКАВУ ВЯРНУСЯ

*Вершы*

***Зэкаў Анатоль Мікалаевіч*** нарадзіўся 20 студзеня 1955 года ў вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт ГДУ. Працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк», у Гомельскім райкаме камсамола і ЦК ЛКСМ Беларусі, у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Добры вечар», «Сталіца», «Книга и мы», «Беларуская лясная газета», часопісаў «Вожык», «Полымя», «Вясёлка», у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Аўтар звыш сарака кніг паэзіі і прозы. Лаўрэат літаратурных прэмій імя Янкі Маўра Мінскага гарадскога аддзялення СПБ і імя Васіля Віткі рэдакцыі часопіса «Вясёлка», прэміі «Залаты Купідон». Ганаровы грамадзянін Буда-Кашалёўскага раёна.

## БАЦЬКАВА ХАТА

Пасля далёкіх падарожжаў
у хату бацькаву вярнуся,
што ў цішыні стаіць над Сожам,
каторы год марнее ў скрусе.

Самотна ёй адной на свеце,
на свеце белым і бясконцым.
Няхай над ёй і сонца свеціць,
аднак не грэе хату сонца.

Нялёгкі лёс яе бядачы,
гаротны лёс і немінучы.
Мы называем хату дачай,
а ёй ад назвы той балюча.

Не трэба ёй турбот багата,
не трэба ўвагі ёй замнога,
ёй хочацца жылой быць хатай,
ёй хочацца цяпла жылога.

## ПІВА ДЛЯ КАРАТКЕВІЧА

У смузе, крыху сінеючай,
бачыў я, як у бары
заяц піва Караткевічу
з асалодаю варыў.

Хоць сядзеў, ад страху млеючы,
што натрапіць воўк, аднак
ведаў заяц: Караткевічу
піва будзе ў самы смак,

бо, з сябрамі сёння седзячы
(у застоллі — не слабак!),
заўтра будзе ў Караткевіча
вой які яшчэ сушняк.

Вось і змушаны зай дзейнічаць —
варыць піва пад сасной,
каб паправіць Караткевічу
і здароўе, і настрой.

## УСПАМІН ПРАЗ ГАДЫ

Гады нацягнуць павады —
і праз гады я ўсё ж згадаю:
цвілі ў Патапаўцы сады,
аж захлыналіся, у маі.

З сястрой гулялі на двары,
за цацкі біліся з сястрою.
То мне трапляла ад сястры,
то ад мяне сястры парою.

Курэй пусціўшы ў агарод,
імкнуліся адтуль іх выгнаць.
Жылі, не знаючы турбот,
якія потым нас спасцігнуць.

Выпісваў бусел віражы
над хатай нашаю над самай.
Яшчэ на свеце тата жыў,
яшчэ жыла на свеце мама.

Як лёгка ўсё ж было тады
аб будучым нам марыць.
Гады нацягнуць павады —
і памяць лейцамі ударыць.



ПРОЗА

# Валянціна Драбышэўская

# ГОРКІ ЦУКАР

*Кароткая аповесць*

***Драбышэўская Валянціна Станіславаўна*** нарадзілася 17 кастрычніка 1972 года ў вёсцы Вялікая Рагозніца Мастоўскага раёна. Закончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Аўтар трох паэтычных зборнікаў і чатырох кніг для дзяцей. Лаўрэат Міжнароднай Пушкінскай прэміі (2017). Працуе намеснікам дырэктара па інфармацыйных тэхналогіях ТАА «РыэлтБелІмідж».

## Незнаёмка. 7 чэрвеня 2000 года

Дзевяностагадовая бабуля ўжо больш за гадзіну сядзела перад абразом і малілася. Яна так рабіла кожны ранак і кожны вечар. Колькі памятала сябе: і ў вайну, і ў мірны час, і пры панах, і пры камуністах. І калі гадавала сваіх шасцёх хлапчукоў, і калі жыла адна. І калі прыязджалі ў госці сыны з нявесткамі і ўнукамі, і калі прыходзілі па дапамогу людзі. Шчыра малілася, уплятаючы ў ружанец разам з нябёснай узнёсласцю свае простыя словы.

Чэрвеньскае сонца даўно пазірала ў акно. Сын Альбін і нявестка Гэля, у якіх ужо пяты год жыла бабуля, управіліся па гаспадарцы і шпарка ўвіхаліся ля пліты на кухні. Сняданак гатовы. Гэля ціхенька прыадчыніла дзверы ў пакой свякрухі:

— Мама, пайшлі падсілкуемся, ці, можа, Вам сюды прынесці?

— Не, Гэлечка, не трэба. Снедайце самі. Я пакуль не хачу. Потым...

Баба Маня паглядзела ў акно. Сонечны прамень, як бы гуляючы за фіранкай, прабягаў раз-пораз па бледным твары жанчыны. У такія хвіліны вочы заплюшчваліся і бабуля ўздыхала.

«Летняе сонейка як дзіця: усе яго любяць і ад яго ж стамляюцца. Але без дзяцей і сонца нельга: жыццё скончыцца... — развяжала старэнькая і як бы гладзіла дрыготкай рукой гарэзлівы сонечны прамень, у якім мітусіліся маленькія істоты. — Вось і мы як гэтыя пылінкі перад Богам... Дай, Божа, нам ласку сваю, выпестуй Святлом сваім! Амэн!»

Думкі Бабы Мані перапыніла гучная размова. Узяўшы кіёчак, жанчына, шоргаючы хворымі нагамі па падлозе, пайшла на веранду, адкуль чуліся галасы.

— Я вас прашу, пусціце да бабы Мані! Дачка прападае... — плачучы, угаворвала нявестку з сынам незнаёмая жанчына ў чорнай хустцы, з-пад якой павыбіваліся сівыя з плямамі рыжай фарбы валасы.

— Не сорамна табе, Яніна? Мама зусім слабая. Дажывí да дзевяноста — тады зразумееш... — абуралася нявестка. — І калі даведаецца баба Маня, чыя ты дачка, то адразу выганіць.

— Баба Маня добрая! — не здавалася незнаёмка. — Лёню Станкевічаву прыняла ж. А яе ж бацька з маім тады...

— Дык твой бацька Лёнінага і «грохнуў» па-сяброўску, — умяшаўся ў размову Альбін.

— Хто там ведае... — уздыхнула незнаёмка. — Што было — тое сплыло... Дачка ж мая невінаватая, што дзядуля яе... бандыт... Ён ужо даўно на судзе найвышэйшым. Пусціце! Богам малю!

— Гэлька, хто гэта? — звярнулася да нявесткі баба Маня.

— Ой, мама, я і не чула, што вы з пакоя выйшлі, — разгубілася Гэля. — Снедаць будзеце?

І тут незнаёмка, упаўшы перад бабай Маняй на калені, стала лямантаваць:

— Дапамажыце! Выратуйце дачку маю Аліну! Два разы ў пятлю лезла! Чэрці нейкія водзяць... А ёй жа толькі трыццаць пяць! І муж у яе добры, і дачушка прыгажуня. Што робіцца з маёй Алінкай? Мы ўжо цэлы свет абышлі, ніхто рады не дасць... Баба Маня, толькі на вас надзея! Ногі цалаваць вам буду! Выратуйце маю дачушку! Яна тут, у машыне, ля вашай хаты сядзіць. Чакае, гаротная...

Баба Маня перахрысцілася, паглядзела ў мутныя карыя вочы незнаёмкі.

— Устань. Чыя ты?

— Яніна я. Душкова... — амаль прашаптала тая.

Бабуля пахіснулася, але моцная рука сына падтрымала яе.

— Мама, давайце я вас у пакой адвяду. Няма ў людзей сумлення, што ж зробіш... — раскіпяціўся Альбін.

— У сад мяне адвядзі, на лаўку, — ціха папрасіла баба Маня і гучней, звярнуўшыся да заплаканай Яніны, прамовіла: — Па абедзе прыходзьце.

— Дзякуй! Дзякуй, баба Маня! Дай Бог вам здароўя! — узрадавана лапатала нечаканая госця.

Але бабуля ўжо не чула яе. Размясціўшыся на лаўцы пад яблынькай, звярнулася да сына: — Альбінак, прынясі вады.

Руплівыя пчолкі трапяталіся пад дрэвам, шукаючы слодыч кветак у сакавітай траве.

— Усім хочацца салодкага, але ж якім горкім бывае цукар...— з жалем вымавіла жанчына і абхапіла танюткімі, высахлымі ад старасці рукамі галаву, пакрытую белай, у блакітныя пялёстачкі, хусцінкай.

— Мама, вам дрэнна? — захваляваўся Альбін. — Вось я вады прынёс. Можа, карвалолу выпіць?

— Усё добра, сынок. Стась яшчэ не прыехаў?

— Не... — схаваў вочы ад маці Альбін.

«Зараз, — думаў мужчына, — усіх сыноў пералічыць... А што мне адказаць? Браты там, высока-высока ў небе... Стась загінуў у 1989-м, Валодзька памёр

у 1995-м, Вацлаў разам з жонкай угарэў у тым годзе, Тадзік толькі месяц як адышоў на той свет, не справіўшыся з анкалогіяй. Янак ужо дваццаць гадоў не піша… Што адказаць табе, матуля?! Толькі я ў цябе і застаўся…»

А жанчына працягвала:

— Вацё не забягаў? Як яго Лілька? Ходзіць ужо?

— Ходзіць, мама, не хвалюйцеся. У санаторыі Вацё з Ліляй…

— А Тадзік не званіў?

— Не званіў, — ізноў схлусіў Альбін, счапіўшы да болю рукі за спінай.

— Трэба Валодзьку з Янкам пасылкі сабраць. Што яны ў сваіх гарадах бачаць…

— Збяром, матуля, збяром…

— Які ж ты добры ў мяне, сынок! Такі ж, як і тата! І Гэлька твая таксама добрая, чулая, руплівая. Трэба нам на Раство ўсім сабрацца. Памятаеш, як калісьці?

— Памятаю… — Альбін адчуў пякучы боль пад лапаткай: сэрца маці сцерла з памяці страшныя страты, але берагло шчаслівыя і светлыя хвіліны жыцця.

— Добра, сынок, ідзі па сваіх клопатах. Я тут адна пасяджу, на неба пагляджу, сонца паўслаўляю, успаміны паганяю…

Мужчына пайшоў да летняй кухні, размясціўся пад навесам на ўслончыку і стаў плесці кошык, раз-пораз паглядваючы на маці. «Гэта ж трэба, — думаў ён, — матулі ўжо дзевяноста, а спіна прамая, як у дзяўчыны. Дзякуй Богу!»

Бабуля падняла заплюшчаныя вочы да неба (менавіта так, на яе думку, можна было ўсталяваць сувязь душы з Айцом Найвышэйшым. Так і дзяцей вучыла: «Глядзіце ў неба, заплюшчыўшы вочы, тады шмат убачыце») і прашаптала:

— Езу мой, Езу! Дзякуй, што выпрабоўваеш сэрца маё, дасылаючы па дапамогу дзяцей і ўнукаў тых, хто пакрыўдзіў мяне. Дзякуй, Святы Езу.

Баба Маня выдыхнула горыч і зрабіла глыток вады.

## Хлеб ды цукар. 8 красавіка 1946 года

— Наглыталася? — паныч Павел Зухоўскі ткнуў руляй вінтоўкі ў жаночае цела, што ляжала на зямлі.

— Не, жывая. Напэўна, спалохалася, калі нас пачула, ды схавалася пад кладкай, — адказаў Душко, развязваючы вузельчык з мешкавіны. — Гэта Станкевіч на беразе знайшоў.

— Быдла, — сплюнуў Зухоўскі, — не сябе ратавала, а клунак. Ёсць што ўзяць?

— Хіба толькі хлеб ды кавалак цукру. Яшчэ малако ў бутлі. Відаць, батрачка.

— Лепш бы гарэлкі набатрачыла, а так… Адкуль выцягнуў, там і пакінь. Няма чаго па начах гойсаць. Нам сведкі не патрэбныя.— Зухоўскі азірнуўся ў перадранішнюю красавіцкую шэрасць і крыкнуў: — Збіраемся, хлопцы!

— Гарэлка, пан Зухоўскі, на возе ёсць, — мармытаў услед панычу Душко. — А гэтае быдла я зараз…

Душко нахіліўся над жанчынай, якая ніцма ляжала на пакатым беразе Зяльвянкі, і разважаў: ці за ногі яе ў ваду сцягнуць, ці за рукі. Ён адразу пазнаў сваю суседку Марыю, але змаўчаў. Ведаў, што Павел Зухоўскі паважае гэтую ганарлівую прыгажуню з зялёнымі іскрыстымі вачамі: з дзяцінства сябраваў з яе мужам Пятром, а цяпер яна дапамагае яго маці. Але была ў Душка аса-

бістая крыўда на Марыю. Заляцаўся ён да яе, маладой удавы, ды адмовіла дурніца, яшчэ і вядром вады абліла. Няхай цяпер сама і захлынецца...

— А ці не Марыя гэта Пецева? — гучны бас падпітага Юзафа Станкевіча прагрымеў над вухам Душка як грамавы грукат, і бандыт са злосцю пачаў спіхваць нагамі ў раку цела жанчыны.

— Адным грахом больш, адным менш, — працягваў басіць Юзаф. — Шкада сыноў Пецевых. А табе, Душко, відаць, нікога не шкада. Ох, жыццё маё забыццё... Падла ты, Бронак, а яшчэ крыж носіш. Я б толькі за спеў чароўны не чапаў Марыю. Як яна спявала:

Зялёна лісце, белы каштаны,
Зялёна лісце, белы каштаны,
Зялёна лі-і-сце, белы кашта-а-ны,
Ой, як-то сумна, як вычар стане.

Сакавіты бас Юзафа гучаў ужо на ўсю акругу.

— Ты чаго равеш, як мядзведзь недабіты. Дык я зараз і прыб'ю! — падскочыў да спевака Зухоўскі.

— Дык і прыбі! — сапраўды па-звярынаму зарычаў Юзаф. — А Пятро за сваю жонку табе і з таго свету глотку перагрызе, сябра ліслівы.

— Ты што пляцеш, морда?! — сцяўшы зубы, прашыпеў паныч.

У час гэтай гарачай сваркі Душко спіхнуў жанчыну ў раку і пабег да воза — запіць самагонкай дрыжыкі злосці, агіды і страху.

Раптам Юзаф адпіхнуў паныча, кінуўся ў ваду і праз некалькі хвілін ужо ратаваў жанчыну на беразе.

— Марыя?! — Зухоўскі знямеў на хвіліну, пасвяціўшы керасінкай на бледны твар выратаванай, і гучна скамандаваў: — Хутчэй на воз! Нясі хутчэй! — У імгненне выхапіў з рук Душка бутэльку. — Трэба расцерці гарэлкай! Хутчэй! Хутчэй!

— Спярша трэба адзенне мокрае зняць, — аддыхваючыся, параіў Юзаф, трымаючы на моцных руках амаль беспрытомную жанчыну, з якой ручайкамі сцякала вада. — І ёй, і мне.

— Дык і здымі, ратавальнік. — Зухоўскі мітусіўся ля воза. — Вось кажух ёсць, кірзавыя боты, вопратка нейкая...

— Душко з пустымі рукамі з вёскі не вяртаецца, вядома, — прахрыпеў Станкевіч, сцягваючы з сябе мокрае адзенне. — Сёння яму і падзякаваць за гэта можна. — Крыкнуў праз плячо: — Дзякуй, ганучнік!

Пакуль Юзаф расціраў і пераапранаў жанчыну, паныч падышоў да сваіх паплечнікаў. Бронак Душко, Стась Лапцэвіч і Янак Рабец стаялі на ўзгорку і пра нешта перагаворваліся.

— Няўжо ты, Душко, не пазнаў Марыю Пецеву? — са злосцю ў голасе спытаў паныч.

— А дзе ж ты пазнаеш? — паспрабаваў з'ехіднічаць бандыт. — Для мяне батрачкі ўсе на адзін твар.

Зухоўскага аж песмыкнула.

— А ты ў нас хто? Забыўся, адкуль я цябе выцягнуў, паскуда? Назад у свой хлеў развалены захацеў?! Дык ідзі! Не трымаю.





## Яўген Хвалей

# МАЙСКІЯ ДРЭВЫ МАЙГО ДВАРА

*Вершы*

***Хвалей Яўген Іванавіч*** нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў вёсцы Белькаўшчына Стаўбцоўскага раёна. Скончыў Мікалаеўшчынскую сярэднюю школу імя Якуба Коласа (1965), філалагічны факультэт БДУ (1971).

Пасля школы працаваў у рэдакцыі стаўбцоўскай райгазеты «Прамень», пасля ўніверсітэта — дырэктарам Мінскага абласнога Дома народнай творчасці (1972—1975), на Беларускім радыё і тэлебачанні (1976—85), у выдавецтвах «Народная асвета» (1972), «Юнацтва» (1985—2002), «Мастацкая літаратура» (2002), часопісах «Крыніца» (2003), «Родная прырода» (2005—2006), газетах «Літаратура і мастацтва» (2004 ), «Весці Першамайскага раёна» г. Мінска (2007—2008).

Аўтар паэтычных кніг «Ярына» (1979), «Прычасце» (1983), «Зялёны прамень аеру» (1987), «Квадры памяці» (1992), «Прыстань віцінаў» (1996), «Дзе хвалі срэбна-залатыя» (2009), «Маёнтак» (2018), зборніка гумарыстычных вершаў «Год Парсюка» (2019), кніг аповесцей «Пацукі» (1990), «Прынцэса тусоўкі» (4 выданні —2000, 2008, 2012, 2017), «Анжэла з Былькаў» (2012), «Вяселле на Кіпры» (2012), «Не пакідай мяне, Аля» (2016), «Нож» (2020), раманаў «Серабрыстыя таполі» (2015), «А на беразе тым…» (2021).

Выдаў зборнікі вершаў і казак для дзяцей «Насціны гасціны» (1989), «Каця на планеце радапедаў» (1997), «Дзіва-сны дзяўчынкі Вікі» (2002), «Яблык з радзімкай» (2017).

Лаўрэат рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2012).

* * *

Вось і прыйшла ваша пара,
Майскія дрэвы майго двара.
Пара цвіцення, пара летуценняў,
Пара кахання і светлаценяў,
Пара ЯГО
і пара ЯЕ,
Калі салавей у сэрцы пяе…
Мой самы любы і страсны час…
Я веру: пэўна ж, гэтак і ў вас,
Майскія дрэвы майго двара,
Вы сёння героі майго пяра.

## СПАКУШАЛЬНАЯ ЧАРОМХА

Ах, хуткацечнае цвіценне,
хуткацечнае...
А ў хуткацечнасці ёсць, пэўна, доля вечнасці.
Ты ловіш, быццам вуснамі, пялёсткамі
Імгненне, што падоранае вёснамі.

Ты ўся гарыш,
Ты ўся трымціш пад ветрам,
Табе імгненне падаецца вечнасцю.
Бо заўтра будзе позна —
ападзе твой цвет,
Як снег зімою...
Толькі белы след...

## АЛЫЧА І КЛЁН

Маленькая алыча
Ледзь дастае да клёна пляча.
А цягнецца, цягнецца ўгору,
Адным толькі цветам гаворыць...
Вымольвае-просіць і ноччу, і дзённа
Адзін толькі позірк,
адну ўсмешку клёна.
А ён,
клён, стаіць у гардыннай паставе,
І вуснаў яго алыча не дастане...
І ціха так абляціць, адгарыць —
А як хацела сябе падарыць...

## ВІШНЯ І ЧАРЭШНЯ

Паглядная вішня,
Прываба-чарэшня...
Нібыта ў людзей —
Цнатлівасць
і грэшнасць.
Цнатлівасць цвіцення...
Пра грэшную завязь
І мараць,
і трызняць
У сне і наяве.
А завязь схавае
Зялёнае лісце...
І ў гэтым быцця
Зямнога ўся існасць.

ПРОЗА

Людміла Лазута

# ТЫ ГАВАРЫ, КАБ Я ЎБАЧЫЎ ЯЕ ЗНОЎ

*Апавяданне*



Лазута Людміла Паўлаўна нарадзілася 27 чэрвеня 1954 года ў вёсцы Едначы Слонімскага раёна. Сярэднюю школу скончыла ў Слоніме. Пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута працавала ўрачом-педыятрам у Гродзенскай вобласці і ў Гродне. З 1989 года жыве ў Мінску. На працягу дваццаці гадоў працавала галоўным урачом дзіцячай паліклінікі. Зараз займаецца педагагічнай дзейнасцю, працуе ў БДМУ.

У 2014 годзе выдала кнігу «Імгненні», у 2016-м — «Вузкімі сцежкамі».

Халаднаватае паветра сочыцца праз шчыліну ў аконнай фортцы, наўмысна пакінутую з вечара. Яно здаецца вільготным і густым, шараватым, як гэтая амаль мінулая ноч. З’яўляецца жаданне высунуць руку з-пад коўдры, каб дакрануцца да яго, зачэрпнуць у жменю.

Ноч паціху сыходзіць са сцен, потым спаўзае з мэблі — ужо можна разгледзець далікатныя валошкі на сурвэтцы ля люстэрка. І цяпер, у гэтай дзеі між ноччу і ранкам, асвяжальнае паветра — самы адчувальны сведка надыходу ўжо сённяшніх хвілін і гадзін. Зноў будуць падзеі, сустрэчы, учынкі — запланаваныя і выпадковыя, часам невядомыя і непрадбачаныя. Пацякуць хвіліны зменлівых умоў і абставін, усяго, што навокал, побач і далей, што чакае цябе ў гэтым новым дні...

А цяпер кароткі момант чарговага ўсведамлення — зноў прачнулася занадта рана. Зноў толькі 4.25. Колькі разоў пацягнулася ў ложку, паспрабавала прыгледзецца да павольнага руху стрэлак на цыферблаце бывалага будзільніка — амаль яе равесніка, але усё яшчэ вельмі спраўнага. Прыслухалася да цішыні і пасля гэтых, амаль ужо аўтаматычных дзеяў, неспадзявана злавіла хвіліны амаль забытага адчування добрага адпачынку. Баючыся спалохаць гэты стан, на момант затаілася, зноў заплюшчыла вочы, каб не было перашкод добра запомніць яго, палашчыць і трывала замацаваць у ранішніх пачуццях душы і цела, як дасланае з неба ўзнаўленне сіл і дабраслаўленне магчымасцяў на ўсе сённяшнія клопаты. Упарта ўтрымлівала гэтае адчуванне, бо добра ўсведамляла, што такія хвіліны завітваюць не кожнай раніцай, здараюцца апошнімі часамі ўсё радзей...

Нейк зусім непрыкметна і незразумела, з-за якой такой праявы, пасялілася дзесьці глыбока ў свядомасці раней незнаёмае і таму яшчэ не зусім асэнсаванае пачуццё неспакою. І гэта не тая звыклая руплівасць, якая з'яўляецца перад безліччу нечаканых ці запланаваных раней спраў і абавязкаў. Гэта зусім новае пачуццё, якое жорстка кантралюе амаль кожны момант абуджэння і спакой ранішніх хвілін. Яно хутка апаноўвае свядомасць, амаль фізічна перашкаджае размеркаванаму і звычайнаму руху ранішніх думак, бо прымушае шукаць карані гэтага шчымлівага неспакою ў мінулых падзеях, корпаючыся ў словах, перабіраючы падрабязнасці размоў, і сумнявацца, што там было не так. І зусім невядома, адкуль ён, гэты неспакой, з якога боку, дзе прыткнуўся і знайшоў глебу, каб прыжыцца, — у галаве, у сэрцы, у нервах, дзе? З ім няўтульна, ён з тых адчуванняў, якія немагчыма хутка растлумачыць...

І няма ніякай рады, каб сабе дапамагчы, засланіцца ад непадуладных думак, нечаканых успамінаў, незразумелых прадчуванняў — ад новых ранкаў з неспакойнымі хвілінамі. І жыве гэтае кароткае дрыготкае пачуццё само па сабе, зусім незалежна, непадуладнае асабістым дзеям. Прыходзіць, калі ўздумае. І не фізічны боль яго прыкмета, зусім не. Яно як бы трымціць, падганяе, прымушае спыніцца погляду і самастойна, быццам зусім без жадання Надзеі, накіроўвае яго ў яе саму, у сябе, нібы пругка нахіляе і спыняе імгненні, каб даць магчымасць пабыць сам-насам. І гэтае кароткае існаванне ў сабе не заўсёды мірнае, часам патрабуе вялікіх намаганняў, каб зразумець немагчымасць перайначвання таго, што ўжо здарылася. І што засталася толькі памяць — досвед прадчування. Такое разуменне дапамагае перамагчы ранішні неспакой і не збэрсаць пачатак новага дня. Наша памяць... Яна — перасцярога, яна ж і непадкупны цэнзар...

Хочаш ці не, а снедаць патрэбна. Раней ёй заўсёды падабаліся гэтыя моманты жыцця — ранішнія клопаты. Падабалася завіхацца ля пліты і стала, гатаваць кожным разам любімы сямейны сняданак ці спрабаваць штосьці новае і нештодзённае. Дзесьці глыбока ў душы яна заўсёды спадзявалася, што прыгатаванае з любоўю дасць магчымасць яе сям'і, яе блізкім атрымаць трывалае адчуванне надзейных сіл на пачатку новага дня. Надзея нават была ўпэўненай, што гэта менавіта так, бо сама дагэтуль дэталёва памятае дзівосны і бадзёры настрой ранкаў у бацькоўскай хаце з пахамі бліноў і жоўта-лупатай яечні альбо з жывым водарам распаранай і разамлелай аўсянай ці прасяной кашы з падталымі бакамі кавалачка масла пасярод немалой гліянай міскі...

Але так было раней. А цяпер толькі ўспамін, бо ўжо ў самой дзеці выраслі, гаспадар адплыў да іншага берага, і вось табе маеш — снедай у адзіноце ці, калі хочаш, разам з раннімі тэлевядоўцамі. Калі-нікалі прыходзяць на роздум яе колішнія думкі аб непадуладным канвееры паўсядзённых абавязкаў, аб звычайнай фізічнай стоме, аб марах пра спакойны размераны ранак. Не ўсведамляла тады, што гэтая ранішняя руплівасць і патрэбна кожнай жанчыне, гаспадыні, бо ўзамен яна атрымлівае непараўнальна большае і значнае — лекавыя струмені тае дзіцячае пяшчоты, што адлюстроўваецца шчаслівым бляскам родных вачэй. Праўду казаў адзін вялікі чалавек, што сапраўднае шчасце прыходзіць праз дзяцей, калі зразумееш — побач з'явіліся жыцці, даражэйшыя за тваё...

Праз думкі Надзеі аб дзецях тут жа змяніўся настрой. Захвалявалася ціхая ўсмешка, вырашаючы, дзе спыніцца. Злёгку крануўшы губы, узнялася, каб па-

ціху засвяціць яе вочы, супакоіць і паслабіць напружаны твар. У памяці ўсплылі моманты ранішняга абуджэння сям'і: разважлівая спадарыня цішыня, глянуўшы на гадзіннік, дзеля надзейнага прытулку да лепшых часоў, павольна адплывала кудысьці за шафу, каб не замінаць зборам, бо ў кватэры ўсё раптам варушылася, напаўнялася плёскатам вады, скрыпам дзвярэй і непараўнальна прыемнымі і блізкімі, смяшлівымі і трошкі яшчэ соннымі дзіцячымі галасамі. Хто мае хоць аднаго школьніка, той зразумее Надзею. А калі іх трое? Здагадаліся, ад чаго цішыня за шафу хаваецца?

Дзеці спяшаліся, паспяваючы есці з апетытам, асабліва вясной. Ды і сама гаспадыня з дзяцінства памятала, што ўжо напрадвесні, калі пачынае відавочна прыбываць дзень, увесь час хацелася есці. Патрабуецца значна больш энергіі. Разам з усёй прыродай хутчэй і дзеці расці пачынаюць — увесь жывы свет трымаецца адных законаў. Нездарма ж на кожны Вялікдзень бацькі дзецям новы, большага памеру, абутак куплялі, як і іншыя, ужо летнія ўборы. Ці шылі іх: сукенкі, сарафаны, спадніцы і кашулі — кожнаму пад асабісты густ, як некалі рабіла яе мама...

Адсунуўшы фіранку, Надзя час ад часу назірала за тым, што робіцца за акном, каб вырашыць, па якім надвор'і апранацца. Ды ці зразумееш? На тэрмометры вясновыя чатырнаццаць вышэй за нуль, а ёсць вецер ці не — не здагадаешся: будаўнікі ўсе дрэвы з карэннем павырывалі, нават яблынь не пашкадавалі. Няма на чым квяцістым галінкам гойдацца... Панурыя двары, нібы аблыселыя ад цяжкай хваробы, зусім не радуюць вока, яно ніяк не жадае да гэтага прызвычаіцца. Як дачакацца пары, калі вырастуць сям-там уваткнутыя ў зямлю тоненькія і кволыя саджанцы?..

А вочы чалавечыя — яны прыгажосцю любавацца хочуць, яны ж з паходжання — першы наш павадыр на зямлі, першы наш настаўнік, які вучыць заўважаць і пазнаваць, параўноўваць, чым розніцца сапраўднае ад падробкаў, вучыць здагадвацца, ад чаго сэрца чалавечае ўспыхвае радасным. Гэта ўжо потым усё астатняе — дотык, пах, гук. А спачатку — вока: і адчувае, і слухае, і гаворыць...

Пацмокаўшыся ля дзвярэй, па чарзе разыходзіліся па сваіх кірунках спачатку дзеці — ім у школу да васьмі трэба было дабегчы, потым муж — яму, хоць і на дзевяць, але ехаць далей, а потым — ужо і сама. Паміж адыходам мужа і ўласным заставалася хвілін пятнаццаць на тое, каб паспець прыбраць са стала, упарадкаваць посуд і ўважліва падзівіцца ў люстэрка: раней, гадоў дзесяць назад, толькі дзеля таго, каб прыгожа зафіксаваць непаслухмяныя валасы, а пазней, як і сёння, дарэчы ўжо і «падмалявацца» трошкі, як любіла казаць мама...

Мама... Не перастае трымцець душа ад успамінаў. Немагчыма прадказаць, калі, у які момант свядомасць накіруе думкі ў матуліны куточкі памяці. Ці мінецца гэты боль, ці саслабее? Ужо дзесяць гадоў, як яе няма, а словы ў галаве ўсё гучаць, і вочы — спакойныя і ўважлівыя, усё побач...

Такая цяжкая хвароба ў сямідзесяцігадовым узросце. Доўгія сем месяцаў бальнічнай палаты, этапныя аперацыі. Матуля клапацілася аб тым, каб з Боскай дапамогай на ногі стаць, бо «калі, няроўныя часы, што ў свеце заварушыцца, то трэба быць памагатаркай, а не цяжарам для сям'і». Яна памятала жахі былой вайны і ўвесь час страшылася іх вяртання, засцерагалася нават лішні раз само слова «вайна» вымавіць. Пасля прагляду навін часцей казала: «Каб чаго,

не дай божа, там не заварушылася, для ўсіх жа бяда». А «там» — меліся на ўвазе ўсе месцы з ваеннымі канфліктамі ці палітычныя неспакоі...

Потым месяцы адаптацыі і сумеснае жыццё разам, пад нашым наглядам. І ніякай яе роспачы перад далейшым лёсам, ніводнага слова пра адыход — толькі прага жыцця і хутчэйшага вяртання дамоў да клопатаў, якія чакаюць кожны дзень, бо без яе там цяжка. «Там, на ўзнаўленні Божага храма, кожны чалавек патрэбен, нават, напрыклад, не зусім моцны вартаўнік лепш, чым яго адсутнасць». Такія яна мела думкі, даводзіла нам свае абгрунтаванні аб неабходнасці вяртання.

Жылі на сёмым паверсе. Было відаць, як, едучы ў ліфце, у гэтай абмежаванай прасторы, мама заўсёды хвалявалася, кожным разам казала, што хоць ужо зверху не трэба ехаць, паціху і пешшу да зямлі дайшлі б. Менавіта «да зямлі», ні разу не сказала інакш. Седзячы на лаўцы ля дзіцячай пляцоўкі, вучыла маладых жанчын быць пільнымі, каб дзеткі незнарок пад колы не трапілі: «Дзівіцца па баках зараз часу няма, мае даражэнькія. Архітэктары, відаць, тут ужо сталыя былі, дзяцей падгадавалі. Бо хіба мажліва месцы для машын побач з арэлькай планаваць? Мужчыны пра гэта, наогул, не вельмі думаюць, цешацца сваімі машынамі». Меркаванні аб тым, што архітэктарам можа быць і жанчына, яна не прымала, была цвёрда ўпэўнена, што жылыя дамы — «справа мужчынскай галавы».

Памятаецца, як пасля шпіталя, стоячы ранкамі ля акна, яна доўга махала нам рукой і, застаючыся адна, відаць, дзівілася на далягляд, які, на жаль, хутка звужваўся. Спачатку можна было і ранішняе сонца крыху бачыць, потым ужо толькі кавалачак неба, бо ішло будаўніцтва яшчэ аднаго шматпад'езднага дзесяціпавярховага дома.

Аднойчы за вячэрай і кажа наша ўсхваляваная матуля: «Дзеці, штосьці трэба рабіць. Хіба не бачыце, што гэта за дом атрымаецца? Ён занадта доўгі і вуглаваты, не раўнуючы, як паранены вуж. Добра яшчэ, калі ў людзей не ўсе вокны кватэры ў двор будуць выходзіць, а калі сюды, на адзін бок, то ў пакоі — як у цёмным калодзежы. Як жа ж можна жыць і толькі кавалачак неба бачыць ці ўвечары на нябёсы з зорачкамі не паўзірацца? А што ж цяжарным жанчынам рабіць? Яны ж за дваіх павінны прыгажосць наваколля бачыць. А тут на што дзівіцца? Чым супакойвацца? Як адчуць бясконцасць жыцця і чалавека, не назіраючы вясновае аднаўленне ў наваколлі, у кожным дрэве і ў кожнай травінцы? У гэты ж дом некалькі вёсак заселіцца, які лёс людзей і іх дзяцей чакае?!» Выказаўшы набалелыя думкі, яна цяжка ўздыхнула і адвярнулася да акна — не хацела, відаць, каб мы бачылі слёзы на яе вачах.

Дачка з мужам маўчалі — не ведалі, як цяжарным з даляглядам дапамагчы, унукі-падлеткі пераглядваліся і ўсміхаліся — не разумелі, чаму гэта бабуля да ўсяго неабыякавая...

Зараз Надзя часта думае аб тым, якімі ж багатымі на паразуменні былі тыя цяжкія, доўгія месяцы, колькі рознага і новага яна пра сваю матулю ў час яе хваробы даведалася, чаму навучылася, павялічыла свой досвед працы, колькі думак ад яе слоў дагэтуль цягнецца...

Пасля школы адразу ж з'ехала вучыцца, потым сям'я, праца, не зусім частыя і заўсёды клапатлівыя сустрэчы. Хоць і заседжваліся за размовамі з матуляй да ночы, ды не пра ўсё паспявалася ўспомніць, надзённыя справы найперш патрэбна было вырашаць. А можа, і не зразумела б у тыя свае гады чаго

важнага, галоўнага? Вось і выходзіць — у Бога для чалавека ўсё своечасова. Нават хваробы...

А цяпер ужо і пра далягляд больш ведаў, і што вочы — не толькі частка нервовай сістэмы чалавека, яны — на перадавой жыцця. Ім не толькі тое, што побач, што ўжо, як рэфлексовае, штодзённае і даведзенае да звычкі ці, лепей сказаць, да жыццёвага канвеера, бачыць трэба. Яны ж нас з цэлым сусветам звязваюць, каб памятаць, што мы яго частка. А як убачыць, калі няма магчымасці ўгледзецца? Хіба горш было б ім, нашым вачам, пагледаць вясной на пераўтварэнне пупышак на галінках маці-дрэў у маладзенькія лісцікі — далікатныя і трапяткія, як пачуцці маленькіх дзяцей, ці зімой, калі гэтыя ж дрэвы ўжо як каралеўны ў бліскучым убранні? Нават адна гэтая акалічнасць — магчымасць убачыць таямніцу прыгажосці, якая побач, здзівіцца, уразіцца ёй — мае велічэзны ўплыў на падтрымку памяці кожнага роду, той, якая ўздымае чалавека над усім жывым светам, не адрываючы ад яго.

А яна, гэтая памяць, трымаецца на радасці ад быцця, нечакана натхняе на творчасць, на росквіт талентаў ці проста шырыць далягляд, дае пачуццё залежнасці ад тых, хто побач, ад таго, што навокал, і, бузумоўна, — усведамленне, што ўсё гэта: чалавек, жывёліна, дрэва, кветка, неба, возера — наша еднасць, наш вялікі і малы, наш духоўны, схаваны глыбока, бачны толькі праз позірк вачэй, і фізічны, дакранальны сусвет. І ён дастатковы, створаны Творцам дзеля нас, людзей, дзеля ўсіх, незалежна ад таго, дзе хто жыве. Яго хапае ўсім, калі мець адказнасць за яго, шанаваць тое, што дадзена. Немагчыма нават уявіць, што Той, хто стварыў увесь сусвет і чалавека ў ім, не ведаў, колькі нас у гэтым сусвеце будзе. Наадварот, Ён казаў: «Пладзецеся і множцеся». Недахоп чагосьці зусім не планаваўся...

Іншым разам і ўсплыве думка, чаму ж так здарылася з часам — вырасла шмат людзей на свеце, якім толькі пад носам сваім бачна, таму і справы вырашаюць толькі асабістыя. І зусім ужо нязвыкла стала кожны дзень памятаць пра вялікі і малы сусвет, створаны для жыцця. Таму і нішчыцца ён на сучасным узроўні навуковых і творчых дасягненняў. Хіба ёсць патрэба ў штучнай ежы, калі яна, натуральная, даўно вакол існавала для чалавека яшчэ да яго самога, а цяпер мае і яго ж нацыянальныя асаблівасці.

А каму патрэбныя «творчыя вынаходкі» шматлікіх аўтараў і рэжысёраў, якія вучаць забіваць і па-майстэрску нішчыць усё жывое? І пры гэтым яшчэ ганарыцца складанасцю, дарагавізнай і небяспечнасцю гэтых «высокамастацкіх трукаў». Каму патрэбна расчалавечванне чалавека? Што сее такое мастацтва? Што жнём і далей будзем жаць? Хіба мы забыліся, што жніво — яно для ўсіх, нават для тых, хто не сеяў, а проста маўкліва пагаджаўся з «новымі поглядамі і вяршынямі», атрымліваючы сваё срэбра ад прыбытку з нездаровага попыту...

А чалавек — ён жа ў свет ад вялікай Любові і дзеля Любові з'явіўся, якая да гэтага часу нязменна якраз і пачынаецца ў чэраве матулі, праз яе вочы, яе погляд на навакольны свет, на яго прыгажосць, на яго сапраўдныя, непадрабляльная фарбы і іх сумяшчальнасць у вясёлцы пасля дажджу, таксама нязменнай. І на тыя гукі музыкі, што паціху пачынаюць гучаць у галаве, заходзяць вясёлкай праз вочы-вароты: сем колераў — сем нот! Хіба такое магло здарыцца выпадкова? Яны — вечныя і дазваляюць нам атрымаць гучны падмурак для росквіту рознакаляровых пачуццяў у душы і ўзрастання любові ў кожным ча-

лавеку, каб павялічвалася Любоў ва ўсім свеце. А Любоў — яна «не патрабуе свайго», яна дзеля міру, дзеля жыцця ўсіх...

І чаго ж мы так кучкуемся, што аж дрэвы без патрэбы выпілоўваем? Хіба ж добра гэта — перашкаджаць адно аднаму адчуваць прыгажосць?! Ад гэтых, падзеленых на квадраты, перашкод — сцен суседніх дамоў, бачных вачамі кожны дзень, людзі вельмі нервовымі робяцца. Вучоныя даўно гэта высветлілі, некаторыя і Нобелеўскія прэміі за доказы атрымалі...

Вось яно і выходзіць па праўдзе, як у прымаўцы: чаго вочы не бачаць, аб тым душа і не баліць.Трэба хутчэй нам усім расплюшчваць і праціраць вочы.

А раней тут, на месцы той «вужаватай» новабудоўлі, быў яблыневы сад, а насупраць шапацела і здзіўляла прыгажосцю невялікая дуброва. Ды пра гэта Надзя засцераглася матулі падчас той далёкай размовы паведаміць. Каб зусім не засмуціць яе лёсам вачэй тутэйшых цяжарных жанчын...

Ідучы да прыпынку, яна супакойвала сама сябе. Ужо ж і падумаць паспела: хіба цяпер ёсць падставы, каб спадзявацца на перамены, выціскаць з сэрца безнадзейнасць? З'яўляюцца ж і аздараўляльныя рысы ў жыццеўладкаванні, бо на сённяшніх новабудоўлях дрэвы між дамамі не ўсе выкарчоўваюць, адумваюцца людзі. А некаторыя нават у вёскі вяртаюцца, як і марыла матуля: «Яшчэ гадоў дваццаць — і людзі зноў да свае зямлі вернуцца, бо так задумана для чалавека...»

Заходзячы ў метро, усё працягвала ўгаворваць сябе і тых, каго ў думках уяўляла, што многія з будаўнічага асяроддзя дасканала ведаюць пра вялікую сілу архітэктурнай прафілактыкі. І што такая філасофія вельмі прыбытковая дзеля будучага дэмаграфічнага, вельмі неабходнага для дзяржавы і ўсёй нашай нацыі, росквіту... Вучыць гэтаму нават само жыццё, калі старанна вучыцца. Усё недасканалае гіне ці мінае, і гэта мінецца. Думала-думала — пагадзілася і намерылася супакоіцца...

А назаўтра зноў недасып. «Штосьці з гэтым трэба рабіць. Патрэбныя перамены. Хіба да дзядзькі Івана наведацца? У пятніцу адгул, якраз на дарогу, а ў нядзелю з паўдня назад адчаліць, цэлых два вечары для сумеснага прабывання і размоў». Рашэнне было вельмі хуткім і пры тым — нейкім нечакана бадзёрым...

Ехаць на другім узроўні навюткага аўтобуса раней не даводзілася. Месца ля акна, у самым першым радзе — лепшага для назірання і дарожных роздумаў і не пажадаеш.

З паўгадзіны ў галаве блукалі думкі пра дарожныя клопаты, перабірала справы на тэму: «Ці не пакінула незнарок якіх працоўных "хвастоў"?», нават нешта пра планы на новы тыдзень усплывала. Неяк задуменна і няўважліва, проста механічна, агледзела салон з заклапочанымі ўладкаваннем пасажырамі, без засяроджання слухала аб'явы правадніцы. Карацей, звычайны стан пасля адправунку з вакзала.

Паступова ўсталёўвалася цішыня. Скончыўся шоргат «мяккай паклажы», кольцаў з фіранкамі, сціхла шыпенне праглынутых і недаказаных слоў мікрафонных аб'яў. Святлафоры ўжо ўсе мінуліся. Аўтобус плаўна выкаціўся на трасу, пагойдваўся, набіраючы моц для васьмігадзіннай дарогі.

Так здарылася, што трыста кіламетраў займалі столькі часу, бо пляменніца з дзядзькам былі ўжо жыхарамі розных дзяржаў...

Васіль Казачок

# МІЛЫ СЭРЦУ КУТ

*Вершы*



***Казачок Васіль Андрэевіч*** нарадзіўся 30 ліпеня 1956 года ў вёсцы Гарадная Столінскага раёна. Пасля заканчэння Гараднянскай СШ (1973) служыў у войску. Вучыўся ў Брэсцкім педінстытуце (1977—1982) на філфаку (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры). Працаваў у Гараднянскай сярэдняй школе настаўнікам роднай мовы і літаратуры. З 2018 — загадчык Цэнтра ганчарства ў вёсцы Гарадная. Аўтар паэтычнага зборніка «Прызнанне» (2018).

## КРАЙ МАЛЕНСТВА

Мне душна ў тлуме гарадскім, калі
Па родных я мясцінах засумую.
У лепшы мой куточак на зямлі
Прыеду ў край маленства — Гарадную.

Сустрэне бацькаў двор. О колькі дзён
Я ўпотай аб сустрэчы гэтай марыў!
Ля веснічак пяшчотна дзедаў клён
Палашчыцца галінкаю па твары.

Узрадавана хата падміргне
Падфарбаваным вымытым аконцам.
Руку пацісне тата моцна мне,
Цяплом сагрэе мама, нібы сонца.

Патоне хата ў моры пахаў-чар,
Што разнясе ад печкі мамін боршчык.
На згадку мне прадасць стары ганчар
З мясцовай гліны паліваны горшчык.

Гасцінна пryme даўні сябра — лес,
Пахваліцца мне першымі грыбамі.
Ускружыць галаву пахучы бэз
І нагадае, што было між намі.

Усё мне блізка і знаёма тут.
Душу дзяцінства грэюць успаміны.
О Гарадная — мілы сэрцу кут,
Жамчужынка на беразе Радзімы!

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

Шчасце прывідных кроз —
Дзень святочны вясновы.
Бог Хрыстос уваскрос!
Грэюць радасцю словы.

Так, напраўду ўваскрос! —
У адказ — нібы песня.
Нам збавенне прынёс —
Мы душой уваскрэснем!

Разгавеецца дзень,
Апрануўшы абновы.
Нерашучасці цень
Скіне страху аковы.

Нібы квет дзівасіл,
Ад нявер'я разбудзіць,
Удыхне моцы-сіл
Ён знявераным людзям.

Веру я: мараў-кроз
Мы дасягнем, паверце!
Нібы Збаўца Хрыстос,
Зробім крок у бяссмерце.

## СУСТРЭЧА ВЯСНЫ

У акенца з усмешкаю ранак
Зазірнуў — і ўжо мне не да сну.
Рыпне ўслед мне прастуджаны ганак:
Я іду сустракаць вясну.

Нібы некалі, выйду за вёску,
Апантаны, душой малады.
Тут дзяцінства майго сляды.
Тут юначай вясны адгалоскі.

Сіратліва маўчыць пагорак,
Што дзяўчат клікаў весну гукаць.
Дзе ж падзеліся жаўранкаў сорак?
І вяснянак чаму не чуваць?

Няўжо хлопцы вясне не рады:
Не спяшаюць чаму за сяло?
Няўжо згінулі продкаў абрады?
Няўжо памяці сонца зайшло?

Сэрца поўніцца скрухай і болем...
Не змялее жыцця рака:
Льецца гімнам надзеі над полем
Светла-радасны спеў жаўрука.

## СНЕГ

Над самотнаю вёскаю — снег...
Супакой. Цішыня. Урачыстасць.
Як дзіцячы цнатлівы смех —
Бесклапотны і радасна-чысты.
Нечаканы, маўклівы, густы.
Як усмешка каханай, жаданы.
І стаіш заварожаны ты,
Хараством незямным апантаны.
Снегу ўдзячныя будуць ралля
І яе апякунка — Геба.
Дрэмле сцішаная зямля
У зімовых абдымках неба.
А сняжынкі ляцяць і ляцяць...
Хай ляцяць — будуць людзі з хлебам!
Здасца мне: не сняжынкі ляцяць —
Гэта сам я імкнуся ў неба!

## ТРЫЯЛЕТ

Над вёскай кружыць, кружыць белы снег.
Дрыготкім сном спавіта наваколле,
І вабіць цнотай белае раздолле.
Над вёскай кружыць, кружыць белы снег.
І вольным думам лёгка на прыволлі.
І час, здаецца, прыпыніў свой бег...
Над вёскай кружыць, кружыць белы снег.
Дрыготкім сном спавіта наваколле.





# Георгій Марчук
# БОЖЫ ДАР

*Раман-хроніка майго жыцця.*
*Працяг. Пачатак у №5 за 2024 г.*

## Драматургія

Гэта была Чыжоўка, новы раён Мінска. Сядаеш на аўтобус нумар тры і каціш па горадзе, праз прадмесце Лошыца, паўгадзіны да чыгуначнага вакзала, там садзішся на тралейбус нумар два — і да кінастудыі. Далекавата, але радасць перапаўняла сэрца. Я на кінастудыі! Толіка ўзялі ў групу мастацкага фільма, і ён паехаў у першую сваю кінаэкспедыцыю, а мяне тэрмінова ўключылі ў групу дакументальнага тэлефільма «Поэма о стекле» ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны аператара Веніяміна Арлова. Фільм быў поўнаметражны, і таму экспедыцыя на славуты завод «Нёман» у мястэчку Бярозаўка цягнулася аж увесь студзень 1970 года. Тут і адбылося маё знакавае знаёмства з асістэнтам рэжысёра, таксама студэнтам толькі трэцяга курса тэатразнаўчага аддзялення нашага інстытута Рычардам Смольскім. Мне трэба было асвойваць не толькі прафесію адміністратара, а і прафесію кінематаграфіста. Я не толькі арганізоўваў працэс, але дапамагаў і рэжысёру, і аператару.

Рычард пахваліўся, што піша ці то сцэнарый, ці то п’есу. Я загарэўся — давай у заклад, хто хутчэй напіша п’есу. Так мы селі ў асобных пакоях халоднага будынка Дома культуры і пачалі прыдумваць свае сюжэты. Я, доўга не думаючы, сеў пісаць камедыю на матэрыяле, які добра ведаў, — пра людзей Давыд-Гарадка і пра іх гандаль насеннем кветак, тутэйшы лад і норавы. Назва першай камедыі прыйшла сама сабой — «Люцікі-кветачкі». Сюжэт знаёмы: два суседы пасварыліся, не падзялілі граду ў агародах, а іх дзеці, студэнты ў сталіцы, закахаліся, і ўрэшце іх каханне прымірыла бацькоў. Атрымаўся ў камедыі і любоўны трохкутнік. Выхаваны прапагандай камуністычных ідэй, са сцэны я высмейваў эгаізм, спекуляцыю, цемрашальства бацькоў і ўхваляў ідэі маладых, калі калектыўнае ставілі вышэй за асабістае. Мне хацелася адной п’есай перавярнуць характары герояў. Такі быў час — героі павінны былі перавыхоўвацца і мяняць свае адносіны да жыцця.

…Сэнс слова і складаны, і просты. Чалавек ад прыроды надзелены мужнасцю, смеласцю, разумнасцю, і асабліва гэтыя якасці праяўляюцца ў экстрэмальных сітуацыях: падчас вайны, землятрусу, прыродных катаклізмаў, падчас па-

жару, паводкі, калі чалавек ратуе дзяржаву, асобнага чалавека, дзіця, жывёлу. Падчас войнаў мы бачым масавы гераізм. А зрэшты, на кожным жыццёвым кроку чалавек можа праявіць гераізм. Скажам, абараніў на вуліцы жанчыну ад п'янага нягодніка. І гэта гераізм. У наш мірны час герой — проста сумленны, справядлівы чалавек, які бароніць праўду і справядлівасць, які бароніць дабро і не парушае маральныя прынцыпы грамадства. Героі ў літаратурных творах канцэнтруюць сюжэтныя лініі вакол сябе — гэта і Дон Кіхот, і П'ер Бязухаў, і князь Мышкін. Для героя дастаткова бараніць свае ідэалы. Яго душа пастаянна працуе, яму цікава жыць, ён спачувае нялёгкаму жыццю чалавека і гатовы бескарысліва пайсці на дапамогу слабаму. Героі Васіля Шукшына бароняць у чалавеку чалавечнасць, і гэтага дастаткова, каб чытач быў на іх баку. Зло павінна быць знішчана як фізічна, так і маральна. Адну з галоўных роляў адыгрываюць тут героі. Стаць ідэйным... Ад агіткі мяне ўратавала праўда жыцця, дапытлівасць характару палешука і любоў да сваіх герояў.

...Праз тыдзень мы пачалі падводзіць вынікі: мая п'еса была напісана, а Рычарда — толькі напалову. Адарылі нас таленавітыя майстры сувенірамі, і мы, шчаслівыя, пакінулі пасёлак. У Мінску я папрасіў сакратарку надрукаваць мае «Люцікі» і перадаў для ацэнкі Рычарду, які не зусім эмацыйна, але шчыра ўхваліў маю першую сур'ёзную працу і сказаў: «Ты прыроджаны драматург. Гэта поспех. Усё цікава — і тэма, і героі, і сюжэт. Можна паказваць тэатрам». У мяне выраслі крылы. На радасцях хадзіў па кінастудыі і дарыў рэжысёрам крыштальныя сувеніры завода. Мяне цікавіў увесь працэс стварэння фільма, і таму я літаральна за месяц наведаў усе творчыя цэхі і ўпершыню пасядзеў побач з рэжысёрам у мантажнай, дзе адбываецца канчатковы этап стварэння фільма.

Перадаў я сваю камедыю «Люцікі-кветачкі» ў славуты тэатр імя Янкі Купалы, дзе галоўны рэжысёр, які сябраваў з Андрэем Макаёнкам і планаваў ставіць толькі яго драматургію, згадзіўся, калі будзе вольны час, паставіць яе ў Тэатры юнага гледача. Я між тым, каб не губляць час і доўга не чакаць прэм'еры ў Тэатры юнага гледача, пакінуў экзэмпляр камедыі ў Рэжысёрскім доме народнай творчасці, дзе была лабараторыя народных тэатраў Беларусі, там яе і надыбаў вопытны рэжысёр Мазырскага народнага тэатра Міхаіл Колас. Родам ён быў, як і я, з Палесся, з мястэчка Лельчыцы, завочна вучыўся на рэжысёрскім аддзяленні тэатральнага вучылішча імя Шчукіна ў Маскве. «Я пастаўлю, Марчук, тваю п'есу», — сказаў ён мне па тэлефоне, чамусьці і далей меў звычку называць мяне толькі па прозвішчы. Чакаць прэм'еры давялося два гады, але я не сумаваў, ствараў сатырычныя п'есы, нёс іх у Міністэрства культуры, і спагадлівая рэдактарка Ніна Загорская іх ахвотна набывала за грошы.

...Пры першай сустрэчы Андрэй Макаёнак падаўся мне пахмурным, раздражнёным. Я яшчэ падумаў: чаго гэта чалавек не ў гуморы? Прыемныя знешнія дадзеныя, чарнявы, чырванашчокі. Хадзіла чутка, што яму ідуць са спектакляў па яго п'есах вялікія працэнты і што ён будуе вялікую дачу ў Ждановічах. Ён без асаблівай цікавасці ўзяў мае «Люцікі» са словамі «Прачытаю, толькі не гані». Не пытаўся, адкуль я родам, калі пачаў пісаць. Суха развіталіся. Можа, настрой у яго быў дрэнны з таго, што былі праблемы ў сямейным жыцці: ён развёўся з жонкай. Усё можа быць. За плячыма ў мяне, акрамя гэтай, было ўжо восем аднаактовых п'ес, і я пачуваў сябе драматургам. Пачаў хадзіць у Саюз пісьменнікаў у будынак каля Цэнтральнага камітэта партыі. Там збіралася моладзь, у асноўным паэты, а я дык прарываўся на пасяджэнні праўлення, мне ўсё хацелася пазнаёміцца з вядомымі пісьменнікамі. Усе яны былі вясёлыя, гучна рагаталі, апавядаючы нешта адзін аднаму. Крытыка твораў калег была вельмі асцярожнай, у асноўным хвалілі творчасць

кіраўніцтва Саюза ды гродненца Васіля Быкава. Акрамя Андрэя Макаёнка, я пазнаёміўся з драматургам і рэжысёрам, сябрам Андрэя Ягоравіча Пятром Васілеўскім і яго жонкай, дзякуючы якой, а яна працавала ў часопісе «Работніца і сялянка», было надрукавана маё першае гумарыстычнае апавяданне. Цэнтральны камітэт камсамола, каб згуртаваць маладых, раз у год праводзіў чатырохдзённы семінар творчай моладзі, на які ўпершыню патрапіў і я. Так, у Гродне, у лясным пансіянаце, я пазнаёміўся з кампазітарам Валерыем Івановым, паэтамі Алесем Разанавым, Раісай Баравіковай, эканамістам Антанінай Моравай — будучым міністрам працы і сацыяльнай абароны насельніцтва, мастакамі Міколам Селешчуком, Уладзімірам Тоўсцікам, акцёрам Арцёмам Ткачэнкам. Закладзенае сяброўства пасля працягвалася доўгія гады. Я напісаў лісты пра свае літаратурныя поспехі брату Сашу ў Гарадок і брату Янеку, ужо маёру, у далёкі Чалябінск.

...«Увесь час пішы камедыі ды нясі іх да Макаёнка — няхай надрукуе ў сваім часопісе «Нёман» ці падтрымае твой новы сябар», — казаў аднакурснік Павел Быкаў. Яго па-нейкай прычыне перавялі з акцёрскага факультэта да нас на тэатразнаўчы. Ён і не ўбіваўся. Яго час ад часу запрашалі на эпізоды на кінастудыю, сам жа ён працаваў інспектарам манежа ў цырку. Гэта быў чалавек-аркестр, іраніст і гарэза, майстар апавядаць розныя пацешныя гісторыі, ведаў мноства анекдотаў. Ён рана ажаніўся і вазіў з сабою на гастролі па ўсім Саюзе жонку з малою дачкою. Любіў імправізацыі і рызыку. Слаба рыхтаваўся да сесіі (дзе там у цырку знойдзеш вольны час, калі давалі па тры прадстаўленні на дзень?). Вырывалі мы адзнакі нахабствам. Была ў нас маладая выкладчыца англійскай мовы. Павел у школе вучыў нямецкую і мусіў у інстытуце пачынаць амаль з нуля. Садзіўся на першую парту, глядзеў ва ўпор на зніякавелую выкладчыцу з болем і любоўю.

...Сціплае вяселле.Трэба сказаць, што тактоўныя бацькі маёй жонкі Леанід Міхайлавіч і Людміла Сцяпанаўна, як і бабуля Шура, брат Аляксандр ні словам ні жэстам не паказалі свае негатыўныя адносіны да выбару дачкі. Сабралі на стол, пачаставалі нас, павіншавалі. Забраў я сваю маладую жонку да сябе на кватэру. Цешча напакавала нам кансерваў, каўбасы, сыру. Толік мой быў у кінаэкспедыцыі. Селі мы з жонкай на ложак, як сіроты, і толькі цяпер уцямілі, што мы сям'я, што пачынаецца новае жыццё. Раніцаю, калі я яшчэ спаў, мая Наталка наварыла першы ў сваім жыцці боршч. Мяса не было, заправілаількамі. І трэба ж такому было здарыцца, заехаў да мяне мой сябар па кінастудыі Рычард па нейкім дробным пытанні. Мы пачаставалі яго баршчом. Сябар папрасіў дабаўкі, пахваліў: «Жорж, табе пашанцавала. Добрую гаспадыню Бог паслаў».

Так лёс звязаў мяне з цесцем, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Леанідам Чарновым, карані якога былі з Магілёўскай губерні, і з цешчай Людмілай Сцяпанаўнай, родам з Ленінграда. Яе родзічы былі ў Піцеры, сярод сваякоў быў і марскі афіцэр. Бабуля Шура перад самай вайной пераехала з мужам і дачкой у Мінск. Часам, калі мы мелі вольны час, расказвала мне, як за дапамогу партызанам яе мужа немцы моцна пабілі і кінулі ў яму з адходамі мазуты. Сама цешча ў дзесяцігадовым узросце хадзіла збіраць на рэйкі вугаль, і яе ледзь не застрэліў паставы салдат. Доўгі час яны жылі на Чыгуначнай вуліцы, і толькі калі зяць Леанід Міхайлавіч уладкаваўся асабістым вадзіцелем акадэміка Турбіна, па просьбах самой бабы Шуры Акадэмія навук выдзеліла шматдзетнай сям'і шафёра Турбіна двухпакаёвую кватэру ў доме акадэмікаў і дактароў навук. Пазнаёмілі мяне і з маці Леаніда Міхайлавіча. Яна з малодшым сынам жыла ў цэнтры Мінска, у двары Дома кнігі. Ад бабы Броні я даведаўся, як падчас вайны яны ў сваёй кватэры хавалі яўрэйскую дзяўчынку.

Суседкай бабы Броні была паэтэса Эдзі Агняцвет. Аднак мне з ёй пазнаёміцца не давялося, давялося толькі яшчэ ў школе спяваць гімн на словы паэтэсы «Ой, мой Мінск, мая сталіца Беларусі роднай». Раз на месяц мы наведваліся да добрай бабы Броні абедаць. Ад яе я пачуў, што яе прадзед быў вядомым у царскай Расіі знахарам і прозвішча было ў яго Магіла, якое пасля перапісаў стала Лебедзеў. Казалі, што да яго прыязджаў сам рускі цар. Засталася ў памяці гісторыя, як ён выгнаў змяю з-пад хаты аднаго селяніна. Запаліў касцёр каля хаты, абышоў яе тройчы і загадаў: «Пакінь гэты дом, выпаўзай!» Змяя выпаўзла і кінулася ў агонь. Так мясцовыя перадавалі гэтую гісторыю з году ў год. Вольнае халасцяцкае жыццё нядоўга кіравала маім аднакласнікам Мішам па мянушцы Каханчык. Паехаў ён у Гарадок да бацькоў і там знайшоў сабе жонку — дачку майго хроснага бацькі Калько Мікалая, стрыечнага брата маёй мамы.

...Хто б там і што ні казаў, а найвышэйшая радасць чалавека — нараджэнне дзіцяці, як і найвышэйшая асалода — пісаць пра маці і пра радзіму. Гармонія ў нашай сям'і была цудоўная, а вось побытавыя ўмовы складаныя. Як я пашкадаваў тады, што не ўтрымаў грошы на ашчаднай кніжцы, было б цяпер за што будаваць кааператыў. Я ведаў шмат акцёраў мінскіх тэатраў, з якімі пазнаёміўся на здымачнай пляцоўцы і ў студыі гуказапісу, была тады такая практыка: здымалі фільм на рускай мове, а пасля перакладалі на беларускую. Ад іх я пачуў, што шмат каму пазычаў грошы багаты Андрэй Макаёнак. А тут і выпадак дапамог: драматург прызначыў мне сустрэчу, бо прачытаў нарэшце маю камедыю. Сустрэліся ў яго на кватэры. На сцяне вялікае фота гледачоў яго спектакля. Не прапанаваў ні кавы, ні чаю. Жыў ён тады адзін. Неахвотна пачаў размову: «Ты разам, братка, з героямі, а пісьменнік, братка, павінен быць над імі. Як Бог. Не яны павінны табой кіраваць, а ты імі. Болей трэба даваць свайго болю, каб ідэя была бачна». А далей перайшоў на ўласны вопыт, як ён шукае сюжэт, рыхтуецца, збірае матэрыял, а п'еса пішацца хутка. «Камедыя — самы складаны жанр. Паспрабуй напісаць драму». Я толькі слухаў, злавіў момант і расказаў, што ажаніўся, нарадзілася дачка і што хачу пабудаваць кватэру, бо нам няма дзе жыць, ці не мог бы Андрэй Ягоравіч пазычыць мне на будоўлю 600 рублёў. Усталявалася непрыемная паўза. Настрой у яго сапсаваўся, ён чамусьці пачырванеў: «Разумееш, братка, нікому зараз грошы не пазычаю. Навучаны. Ты нават не ўяўляеш, колькі ў мяне даўжнікоў. Ніхто ў час не вяртае. А мне і сорамна націскаць. Так што даруй. Не змагу дапамагчы». У жыцці ён быў хлебасольны таварыш. Такія банкеты пасля прэм'ер закатваў, дай Божа. Можа, я патрапіў не ў час. Болей да яго з просьбамі я не звяртаўся, не толькі дзеля грошай, не прасіў падтрымаць і новую камедыю.

Мой калега, сябар па кінастудыі, рэдактар і драматург Анатоль Дзялендзік на гэты конт сказаў наступнае: «Жора, не крыўдуй. Яны ў кіраўніцтве трохі зажраліся. Колькі я яму ні паказваў сваіх камедый, ніколі не хваліў. Раўнівы. Пачынай з тэатраў, сябруй з рэжысёрамі. Пакуль ён верхаводзіць у тэатры Янкі Купалы, нікога туды не дапусціць». Дзялендзік меў рацыю. Толя быў працаўнік, сумленны чалавек. Менавіта ён у 1972 годзе ўвосень патэлефанаў з Дома творчасці пісьменнікаў у Дубултах, што на рыжскім узмор'і, і запрасіў мяне на семінар драматургаў. Ад Беларусі ніхто са старэйшых драматургаў не паехаў, і прападала месца. Я, лёгкі на пад'ём,ірвануў у Рыгу і патрапіў у творчы рай. Асобны пакой, тэлефон, друкавальная машынка, трохразавае харчаванне, побач драматургі з усіх саюзных рэспублік, а сярод кіраўнікоў сам рэктар Літаратурнага інтытута Уладзімір Піменаў, славутыя драматургі Віктар Розаў, Афанасій Салынскі, Леанід Зорын, Аляксей Арбузаў, Іон Друцэ.

Ігар Шаладонаў

# ЗДЗЯЙСННЕ ЎЧЫНКУ ЯК ЖЫЦЦЁВЫ І ТВОРЧЫ ПРЫНЦЫП ПІСЬМЕННІКА ВАСІЛЯ БЫКАВА

***Шаладонаў Ігар Міхайлавіч*** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Сёлета беларуская грамадскасць адзначае стагадовы юбілей класіка айчыннай і сусветнай літаратуры Васіля Уладзіміравіча Быкава (1924—2003). Як вядома, часавы прамежак веку задае ўжо іншую парадыгму і фокус функцыянавання біяграфіі той ці іншай знакамітай асобы, надзяляючы яго фундаментальнай адзнакай — вечнасцю. «Вечнае, — як адзначаў В. Шлегель, — гэта не адсутнасць часу, а ўся яго паўната, у якім усе элементы злучаны ў нешта цэлае» [5, с. 365]. Вось гэтую таямніцу феномену цэласнасці жыццёвага і творчага подзвігу таленавітага пісьменніка наканавана вывучаць усім далейшым пакаленням беларусаў.

Бог і лёс надзялілі юбіляра адным з самых найкаштоўнейшых з дароў — дарам валодання майстэрствам мастацкага слова, талентам літаратара. А ў творчасці кожны сапраўдны пісьменнік імкнецца ўлавіць і адлюстраваць у хуткаплынным сучасным імгненне вечнасці, тое, што заўсёды самае важнае і неабходнае для нацыянальнага і чалавечага выжывання, развіцця і росквіту. Мастацкаму слову належыць магічная сіла ажыўляць гістарычнае мінулае і сучаснае, яно ёсць самае духоўна-жывое ўвасабленне жыццядзейнасці ўсякага народа. У ім замацоўваюцца і ажываюць ўсе яго дасягненні і цяжкасці, яно з'ўляецца свайго роду жывой памяццю народа, паказчыкам велічы яго духу і глыбіні творчага багацця.

З'яўленне паэта ці пісьменніка першай велічыні, адоранага вялікай сілай і чараўніцтвам адлюстравання, здатнага сваёй творчасцю паглыбіцца ў самыя патаемныя думкі і мары свайго народа, — з'ява даволі рэдкая. Але менавіта толькі яны здольныя і толькі ім дадзена найбольш ярка і праўдзіва засведчыць духоўную сілу і маральную вышыню той нацыі, да якой яны належаць. Жыццё і творчасць Васіля Быкава з'яўляецца ў гэтым плане яркім прыкладам вышэйсказанага сцвярджэння.

Васіль Быкаў увайшоў у айчынную літаратуру найперш як пісьменнік ваеннай тэматыкі і праблематыкі, які найбольш выразна і праўдзіва засведчыў анталагічную ўгрунтаванасць беларускай нацыі ў свеце. У яго шматлікіх творах, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны, беларус паўстаў асобай, якая сваёй гранічнай стойкасцю, непамернай ахвярнасцю і подзвігам духу голасна заявіла аб сваёй здатнасці быць сапраўдным гаспадаром на сваёй зямлі.

За больш чым паўстагоддзя творчай дзейнасці В. Быкаў увёў у мастацкую прастору цэлую галерэю герояў, якія памежна дакладна і яскрава раскрылі экзістэнцыяльную прыроду нацыянальнага характару беларуса. Пісьменнік-ры-

гарыст па сваёй аснове, які заўсёды імкнуўся правяраць жыццё і мастацтва па гамбургскім разліку, разгледзеў у гэтакім ракурсе такую анталагічную з'яву і тэму, як чалавек і вайна.

Васіль Уладзіміравіч у сваіх творах заўсёды імкнуўся галоўных герояў праверыць на быційна-памежнай грані чалавечага існавання, каб увачавідкі раскрыць і паказаць іх сапраўдную маральную і духоўную існасць, здатнасць заставацца чалавекам нават у самых неспрыяльных і нярэдка абсурдных жыццёвых сітуацыях і варунках.

Разам з тым трэба канстатаваць яшчэ і той факт, што генератыўны дыскурс усёй ім створанай ваеннай прозы без перабольшання трэба залічыць у разрад антываеннай, таму што пісьменнік пераканаўчым пафасам сваёй творчасці раскрыў тую акалічнасць, што беларускі народ у сваёй аснове ў гэтым трагічна вірлівым XX стагоддзі нёс і выконваў па большасці толькі місію і задачу самавыжывання і самазахавання.

У творчай манеры В. Быкава вайна выступае пэўным панарамным люстэркам па выяўленні экзістэнцыяльнага генатыпу беларускай ментальнасці ў выпрацоўцы такіх фундаментальных рыс народнага характару, як цярплівасць, талерантнасць, трыванне, уменне разлічваць толькі на свае сілы, праяўленне настойлівасці ў пошуку выхаду, здавалася, з неверагоднай, пагранічнай сітуацыі. Беларус выпрацаваў на працягу стагоддзяў спецыфічную сялянскую звычку цярпліва і памяркоўна пераносіць розныя напасці і нягоды, што ў сваю чаргу прывучала і да высокай мяжы трывання болю, крыўды і пакут, давала магчымасць «расцягнуць» прастору часу дзеля гістарычнага выжывання і самазахавання.

А паняцце экзістэнцыі па сваёй сутнасці азначае і ўспрымаецца найперш як усвядомленае быццё чалавека ў свеце. Жыць па большасці і азначае — быць у стане свядомасці, усведамляць, што з табой адбываецца, і разам з тым напружана, цярпліва шукаць, разумець і адчуваць сваё сапраўднае становішча і месца, у якім ты апынуўся «тут і цяпер».

Як вядома, у мастацка-жанравым выражэнні В. Быкаў найбольш выразна заявіў аб сабе як майстар сярэдняй празаічнай формы — аповесці, хоць, безумоўна, ім былі напісаны і некалькі раманаў, а таксама нізкі апавяданняў, прытчаў і нарысаў. У аповесці як жанравай форме асноўным ствральным ідэйна-мастацкім фактарам выступае «канцэпцыя чалавека», якая найбольш поўна знаходзіць сваё ўвасабленне праз аналіз і раскрыццё ўчынкаў герояў твора.

Менавіта ў аповесці аўтар мае магчымасць на абмежавана-фіксаваным прамежку часу і «мінімальна-прасторавым» адрэзку жыццёвага лёсу героя раскрыць вобраз персанажа ў яго адносінах да свету ў самых розных «пластах і сферах» побыту і быцця, хоць і ў абмежаваных праявах, аднак з вычарпальнай паўнатой. У гэтым жанры існаванне індывідуальнасці найбольш адэкватна супадае з фабульна-сюжэтным развіццём падзей, дзе галоўныя героі твораў павінны поўнасцю вычарпаць свой жыццёвы і ідэйны патэнцыял, гранічна самавыявіцца.

У жанры аповесці значна ўзрастае роля канцэтрацыі вобразна-сімвалічнай сістэмы ў раскрыцці эпікі і эстэтыкі творчай рэалізацыі, а таксама паглыбляецца канцэптуалізацыя аўтарскага мыслення. Спецыфіка цэласнага паказу чалавека ў аповесці праяўляецца ў тым, што ў раскрыцці складанага і супярэчлівага характару таго ці іншага персанажа галоўная ўвага звяртаецца на

маральна-псіхалагічную дамінанту адлюстравання яго паводзін і найперш факусіруецца на моманце *ўчынку чалавека* ў той ці іншай сітуацыі. Учынак паўстае ў творы фактарам генерыравання дыялектыкі ідэальнага і рэальнага ў творы, гарманічнай суразмернасці таго, што прамаўляецца, і таго, што адбываецца і ўтрымліваецца ў яго ўнутраным свеце.

Ужо ў ранніх сваіх аповесцях В. Быкаў выразна акцэнтуе ўвагу на тым, што героі яго твораў, рэалізуючы той ці іншы ўчынак, адначасна ажыццяўляюць і свой працэс выбару ісціны натуры свайго ўнутранага «я», фактычна вызначаючы гэтым і свой далейшы лёс.

У аповесці «Жураўліны крык» пісьменнік вельмі падрабязна імкнецца давесці матывацыю ўчынкаў сваіх герояў, каб выразна раскрыць логіку іх паводзін у экстрэмальнай і фінальнай сітуацыі. Кожнаму герою надаецца права раскрыць сябе як праз унутраны маналог-біяграфію, так і праз знешнюю канву паводзін і дыялогаў перад вырашальным боем.

Аўтар асаблівую ўвагу звяртае на элемент рэфлексіўнай глыбіні разваг герояў, імкнучыся засяродзіцца менавіта на спробе раскрыцця выпрацоўкі героямі сваіх трывалых перакананняў па выкананні воінскага абавязку, які так выразна паўстае перад імі ў гэты момант, калі яны застаюцца на пераездзе ўпяцёх баявым заслонам для батальёна.

Так, спрактыкаваны салдат Пшанічны ўжо на пачатку твора сваімі ўнутранымі развагамі не хавае даўняга намеру здацца ў палон немцам. «Так, хопіць. Хопіць мясіць па гэтых разбітых дарогах, хопіць гібець на сцюжы, галадаць, хопіць пакутаваць ад страху, капаць-перакопваць зямлю, глухнуць у баях, дзе толькі кроў, раны і смерць. Даўно ўжо Пшанічны прыглядаўся, чакаў зручнага выпадку, вагаўся і баяўся, але цяпер, трапіўшы ў такую мышалоўку, канчаткова рашыўся. Свая рубашка бліжэй да цела, а жыццё для яго даражэй за ўсё, і захаваць яго можна, толькі кінуўшы зброю і здаўшыся немцам. А вось не заб'юць, дарма, што столькі баюць пра іх — Пшанічны не дзіця і ведае, што і немцы людзі» [1, с. 32].

Цікавым ў псіхалагічным плане ў дадзеным маналогу выступае выслоўе «Пшанічны не дзіця». Аўтар як бы незнарок, але выразна звяртае нашу ўвагу на нізкі і наіўны інтэлектуальны і маральна-духоўны ўзровень персанажа, на яго слаба выражаную індывідуалізацыю, дзе галоўным прынцыпам жыцця, нават будучы салдатам, паўстае простая прымітыўна-вітальная задача — выжыць любым чынам.

У аповесці празаікам выразна праведзены вобразны раздзел паміж персанажамі, што ўнутрана склалі індывідуальную ўстаноўку на сваё месца ў гэтай сітуацыі, на адчуванне свайго доўгу як салдата, які павінен быць верным сваёй прысязе Радзіме (старшыны Карпенкі, салдат Свіста, Фішара і Глечыка), і тымі, у каго яна па той ці іншай прычыне не змагла выспець як цэласная сутнасць характару (Пшанічны, Аўсееў).

Празаіку В. Быкаву кожны раз удаецца знаходзіць розныя мастацкія прыёмы для таго, каб найбольш яскрава і змястоўна паказаць той момант, дзе гэты працэс выяўлення ўнутранай духоўнай канцэнтрацыі героя знаходзіць у творы сваё выразнае выяўленне, а затым рэалізуецца ў канкрэтным учынку дадзенага героя.

Аўтар вельмі лаканічна і выверана, праз думкі і бачанне галоўнага героя, старшыны Карпенкі, падае нам момант гутаркі і пастаноўкі ваеннай

задачы для неспрактыкаванага салдата Фішара, нядаўняга вучонага, кандыдата мастацтвазнаўства, выдзяляючы ў гэтым герою пэўную адметную дэталь-вобраз. «Худы, з запалымі грудзьмі, у кароткім, падпяразаным пад хлясцік шынялі, з забінтаванай шыяй і зашчаціненым тварам, баец меў вельмі ніякаваты выгляд. Аднак *толькі чорныя вочы* пад тоўстымі шкельцамі акуляраў цяпер неяк *ажылі і свяціліся адбіткам далёкай стрыманай думкі.* Старшына падзівіўся тайком, з таго, што вось за гэткім несамавітым выглядам хаваецца адукаваны і, здаецца, не благі чалавек. Праўда, Карпенка быў упэўнены, што ў ваеннай справе Фішар не многа варты, але ў глыбіні старшынёвай душы нешта ўжо расслабла і падабрэла да гэтага байца» [1, с. 27] (Тут і далей вылучэнні ў цытатах нашы. — *І. Ш.*).

*Вочы,* па народнай прыкмеце, шмат у чым і з'яўляюцца тым найбольш яскравым люстэркам душы чалавека, дзе канцэнтруецца яго ўнутраная духоўная энергетыка. І старшына Карпенка менавіта пранікаецца гэтай энергетычнай цэласнасцю вачэй Фішара. І хоць пакуль у старшыны захоўваецца пэўная занепакоенасць фізічнай падрыхтаванасцю свайго байца, аднак ён ужо схільны давяраць яму. І не памыляецца. Фішар у крытычны момант не схібіў, здзейсніў учынак, адпаведны свайму салдацкаму доўгу, не збаяўся ворагаў, якія вельмі блізка пад'ехалі да яго ўкрыцця, і стрэліў у фашыстаў, папярэдзіўшы сваіх таварышаў аб небяспецы, заплаціўшы за гэта жыццём.

Адметным з'яўляецца яшчэ і тое, што вочы Фішара «ажылі і свяціліся адбіткам далёкай стрыманай думкі». Аўтар выразна падводзіць да таго, што ўнутраная цэласнасць пазіцыі інтэлектуала Фішара была выразнай праявай яго ранейшага духоўна-жыццёвага вопыту і што яго будучы гераічны ўчынак — гэта не адвольнае і спантаннае дзеянне, а вынік зусім усвядомленага ўчынку чалавека, які выпрацаваў у сабе глыбінную свядомую індывідуальнасць.

Філосаф М. Мамардашвілі адзначаў: «Чалавек не створаны прыродай і эвалюцыяй. Чалавек ствараецца няспынна зноў і зноў занава. І вось гэта яго няспынная стваральнасць і паўстае вечнай задачай для яго, у люстэркавым адбітку самога сябе ўбачыць сябе «вобразам і падабенствам Божага». Вобраз і падабенства Божае — гэта сімвал суаднесенасці чалавека з тым, з чым чалавек можа паўстаць у якасці Чалавека» [4, с. 88].

Сам навакольны свет не можа сябе ўбачыць і ўсвядоміць звонку, але ў яго ёсць створаны ім самім жывы арганізм эвалюцыі — чалавек як інструмент для самаразумення і самаадчування. Унікальнасць чалавечага існавання пазначаецца яшчэ і тым, што ён (чалавек. — *І. Ш.*) выступае найперш як гаворачае быццё і, больш за тое, дапытлівае быццё, якое імкнецца задаваць пытанні свету і сабе і шукаць на іх адказы. У сваіх творах В. Быкаў шукае і знаходзіць такіх герояў-персанажаў, якія б найбольш дакладна раскрылі паўнату чалавечага пражывання ў свеце, сваімі ўчынкамі і дзеяннямі адэкватна адказаўшы на выклікі часу.

Жыццё і творчасць В. Быкава ахоплівае складаную эпоху, аб'ядноўвае час амаль усяго XX стагоддзя з яго парадам катастроф сацыяльных, ваенных і тэхнагенных. Сэнсам яго жыццёвай і творчай пазіцыі і самарэалізацыі было неспатольнае жаданне намацаць і ўбачыць скрозь тоўшчу пылавога воблака гэтых катастрафічных праяў хоць якіх-небудзь вестуноў і папярэднікаў жаданага, горняга свету.

Людміла Рублеўская

# «ЯК ДОБРА БЫЛО Б СЯДЗЕЦЬ ТУТ З МІЛЫМ ДЗЯЎЧОМ ДА НОЧЫ...»

*Пяць мірных сцэн у творах Васіля Быкава*

*Усе ведаюць: Васіль Быкаў — майстар ваеннай прозы. Трагічныя, драматычныя, гранічна напружаныя сцэны са свістам куль, узрывамі снарадаў, пакутамі і смерцю герояў уразаюцца ў памяць. Але нават у самых «ваенных» творах Васіля Быкава ёсць сцэны мірнага жыцця, паэтычныя, тонка выпісаныя. Іх не так шмат, але яны выконваюць вельмі важную ролю, дадаючы свае фарбы ў агульную карціну. Давайце ўспомнім некаторыя з іх...*

## Вясёлка ў вадаспадзе

Найболей, мабыць, лірычных сцэн у аповесці Васіля Быкава «Альпійская балада». Твор пра немагчымае каханне, якое ўзнікае паміж дваімі збеглымі з фашысцкага канцлагера вязнямі, беларускім хлопцам Іванам Цярэшкам і італьянскай дзяўчынай Джуліяй. Шлях цягам усяго трох дзён. Шлях даўжынёю ў вечнасць, які заканчваецца смерцю Івана. На фоне смяротнай небяспекі — за ўцекачамі гоняцца каты — яшчэ прыгажэйшыя, яскравейшыя карціны прыроды Альпаў: заснежаныя вяршыні гор, зарослыя квітнеючымі макамі лугі, вадаспады...

Пасля ўчарашняга пакутлівага пераходу праз заснежаны, ветраны перавал Іван прачынаецца на самоце, на альпійскім лузе, і шукае, куды адышлася Джулія:

«Буйныя, лапушыстыя, пэўна, не таптаныя нагой чалавека, узгадаваныя вялікаю шчодрасцю прыроды мільёны кветак пераліваліся ўрачыстаю чырванню, ціха варушыліся на слабым ветрыку і імкнулі далёка ўніз, на ўвесь прасцяг гэтага затуленага гарамі лугу — аж пад самы цёмна-зялёны хваёвы масіў... З трывогай у душы, хлопец ababeг калючы рададэндравы зараснік, абсыпаны вялікімі, па кулаку, чырвонымі кветкамі, і з невялікага распадка-раўка наперадзе да яго данёсся шум вадаспада. Хутка ён узбег на травяністую выспу, шум гэты стаў зусім блізкі; з чорнага, блішчастага ад макраты каменнага жолаба, разбіваючыся аб скалу, ліўся зіхоткі струмень вады. Навокал у туманным мроіве мітусіліся драбнюткія пырскі, і, пэўна, ад іх убаку на змрочным каменным фоне вісеў у паветры каляровы кавалачак самай сапраўднай вясёлкі... За паўсотню крокаў адгэтуль пад дажджыстым вадзяным россыпам, захінуўшыся аднымі толькі рукамі, спіной да яго стаяла на камяні і мылася Джулія.

Ён адразу пазнаў яе, хоць на дзяўчыне не было ніводнае адзежыны. Распранутая, яна адразу страціла праклятыя адзнакі гефтлінга і адзін на адзін з прыродаю зрабілася зусім інакшаю ў сваёй палахлівай дзявочай сціпласці, поўнай таямніцы і харaства. Дзяўчына, вядома, не бачыла яго і, насцярожана сцяўшыся, цярпліва падстаўляла сваё худзенькае, лёгенькае цела пад густую пырсканіну струменяў, здавалася, гатовая пры першым жа гуку трапянуцца і знікнуць. Па яе зіхоткіх ад пырскаў востранькіх плечуках блукаў каляровы водбліск вясёлкі».

# ДА 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

## Уладзімір Паўлаў

# МАЛАДАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ ГВАРДЫЯ

Слаўныя старонкі ў летапіс Вялікай Айчыннай вайны ўпісаў камсамол Беларусі. Магчыма, самая яркая з іх — актыўны ўдзел маладых патрыётаў рэспублікі ў партызанскай і падпольнай барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў. Пра гэта пераканаўча гавораць лічбы. З агульнай колькасці партызан Беларусі, паводле колькасных дадзеных Беларускага штаба партызанскага руху, 54 972 — камсамольцы, а моладзі да 26 гадоў было 152 430 чалавек.

Беларускія камсамольцы былі пачынальнікамі многіх баявых спраў у партызанскай барацьбе ў тыле ворага. Летам 1942 г. шырока разгарнуўся рух за стварэнне спецыяльных камсамольска-маладзёжных груп, узводаў, рот і атрадаў. У лістападзе 1942 г. у Суражскім раёне на Віцебшчыне нарадзілася першая ў Беларусі камсамольска-маладзёжная партызанская брыгада імя Ленінскага камсамола (камбрыг — Данііл Фёдаравіч Райцаў). Крыху пазней такія атрады і брыгады сталі ўзнікаць на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Адзін з такіх атрадаў быў створаны ў маі 1943 г. па ініцыятыве камсамольцаў партызанскай брыгады «Дубава» (камбрыг — Фёдар Фаміч Дуброўскі). Для камсамольскага атрада камандаванне брыгады падабрала камандзіра і камісара. У актыў будучага атрада ўвайшлі 15 чалавек. Сярод іх — лепшыя камсамольцы брыгады, якія праявілі сябе ў баях і на заданнях: Іван Алдошын, Павел Чэклін, Анатоль Ханяк, Аляксандр Галубятнікаў, Іван Ялуга, Ніна Пацей, Алена Чэкліна, Дзмітрый Быкаў і іншыя. Атрад атрымаў парадкавы нумар 13. У ліпені 1943 г. у сувязі з раздзелам брыгады на дзве самастойныя, 13-ы камсамольска-маладзёжны атрад увайшоў у склад Лепельскай партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна (камбрыг — Уладзімір Елісеевіч Лабанок, потым — Дзмітрый Цімафеевіч Караленка —– загінуў у баях, Аляксей Васільевіч Ярмаш).

Атрад хутка рос, галоўным чынам за кошт камсамольцаў і моладзі з Іван-Бора, Далікаў, Свядзіцы і іншых вёсак Лепельшчыны і неўзабаве стаў грознай сілай для ворага. Першым камандзірам атрада быў Іван Сцяпанавіч Алдошын, яго замяніў у ліпені 1943 г. Пётр Пятровіч Ліцвінаў (загінуў у баі ў сакавіку 1944 г.), апошнім камандзірам, пад кіраўніцтвам якога атрад злучыўся з часцямі Чырвонай арміі, быў Ілля Карпавіч Баграцоў. Камісарамі атрада былі ў розны час адпаведна Павел Чэклін, Іван Сцяпанавіч Алдошын, Ілля Карпавіч Баграцоў, Віктар Данілавіч Ерашоў. Начальнікам штаба ўвесь час заставаўся Аляксандр Іванавіч Галубятнікаў.

— Улетку 1943 г., калі атрад яшчэ толькі фарміраваўся, —– успамінаў палітрук узвода Анатоль Сямёнавіч Ханяк, — да нас прыбылі вяскоўцы і паведамілі, што фашысты з гарнізона Катоўшчына выехалі рабаваць найбліжэйшыя вёскі. А ў нас тады амаль усе байцы былі на заданні. На месцы заставалася невялікая група партызан. Сілы былі няроўныя, але сядзець на месцы мы не

маглі. Партызаны атрада расцягнуліся шырокім ланцугом, ведучы агонь, хутка мянялі пазіцыі, перабягаючы на новыя месцы. Тым самым мы стварылі пагрозу акружэння, чаго гітлераўцы заўсёды баяліся. З кулямёта трапна біў Уладзімір Ханяк. І карнікі не вытрымалі, пачалі адыходзіць, кінуўшы на полі бою станкавы кулямёт...

Партызаны вялі бai амаль бесперапынна. Так, раніцай 30 жніўня 1943 г. калона фашыстаў да 300 чалавек падышла да вёскі Іван-Бор, якую займаў 13-ы атрад. Камандзір атрада Пётр Ліцвінаў разам з камісарам Іванам Алдошыным і начальнікам штаба Аляксандрам Галубятнікавым прынялі рашэнне абараняць вёску.

Замерлі партызаны: загад камандзіра падпусціць ворага як мага бліжэй. Пачуўся гарматны стрэл. Гэта наводчык Мікалай Сякерын дае сігнал да бою. Першы снарад патрапіў у цэнтр калоны ворага. Выбухнуў дружны партызанскі залп. Бой працягваўся цэлы дзень. Уначы па загадзе камандавання брыгады партызаны адышлі на новыя рубяжы. 35 фашысцкіх салдат знайшлі сваю смерць каля маленькай беларускай вёсачкі.

На працягу лета 1943 г. атрад удзельнічаў у шматлікіх баях з ворагам: каля вёсак Свядзіца, Стайск, Валасовічы і іншых, заўсёды з гонарам апраўдваў сваю назву — камсамольска-маладзёжнага.

Вялікую стойкасць, мужнасць і гераічнасць выявілі маладыя партызаны 19-20 кастрычніка 1943 г., штурмуючы нямецкі гарнізон у Лепелі. 13-ы камсамольска-маладзёжны ішоў у авангардзе ўдарнай групы. Разграміўшы па шляху да горада невялікі варожы гарнізон у вёсцы Забаенне, перарэзаўшы драцяную загароду і закідаўшы гранатамі варожыя дзоты, байцы пайшлі на штурм. Сярод першых уварвалася ў Лепель Ганна Ханяк. Трапным стрэлам, зняўшы вартавога, яна падпаліла харчовы склад, знішчыла сувязь паміж нямецкімі часцямі.

У гэтым баі атрад вызначыўся пры штурме варожых умацаванняў на ўчастку чыгуначнай станцыі Лепель-дэпо. Захопленыя раптоўна, гітлераўцы забегалі ў паніцы, імкнучыся заняць абарону, але ўсюды іх сустракалі знішчальным агнём партызанскія аўтаматчыкі. Асобныя агнявыя кропкі гітлераўцаў жорстка супраціўляліся. Байцы ўзвода Івана Ялугі падбіраліся да іх ушчыльную і закідвалі гранатамі. У гэтым начным баі атрад ачысціў вуліцы Максіма Горкага і Вакзальную, вывеў са строю 30 варожых салдат і афіцэраў. Партызаны падпалілі склад і каравульнае памяшканне, знішчылі 5 дзотаў, захапілі вялікія трафеі.

За арганізаванасць, дысцыпліну і мужнасць у баі за Лепель 13-му камсамольска-маладзёжнаму атраду камандаваннем брыгады было прысвоена ганаровае званне «Баявы». Гэта была партызанская гвардыя. Заслужыць такое званне было нялёгка, і прысвойвалася яно толькі найлепшым з лепшых. Для параўнання скажам, што ў Лепельскай брыгадзе імя І. В. Сталіна з адзінаццаці партызанскіх падраздзяленняў толькі тры атрады мелі гэтае ганаровае званне.

Увесь снежань 1943 г. атрад вёў баі з карнай экспедыцыяй ворага, якая імкнулася аднавіць рух па шашы Беразіно-Лепель. У жорсткіх баях партызаны знішчылі каля 100 фашысцкіх салдат і афіцэраў. Камсамолец кулямётчык Пётр Пазняк, падпускаючы гітлераўскія ланцугі на 50-70 метраў, біў без промаху. Яго другі нумар — Віктар Ляйко, якога перад самым боем прынялі ў камсамол, хутка і ўмела мяняў стужкі, і кулямёт не змаўкаў ні на хвіліну. Разам з тым Віктар яшчэ страляў са сваёй вінтоўкі, пасылаючы кулю за куляй па цэлі. Толькі ў баі каля вёскі Атрубак Віктар знішчыў са сваёй вінтоўкі восем гітлераўцаў.

Напярэдадні 1944 г. камсамольская арганізацыя атрада (сакратар Карл Шатыронак) аб'явіла аб зборы навагодніх «падарункаў». Гэта былі ўзарваныя эшалоны, разбітыя варожыя аўтамашыны, спаленыя масты... І ў навагоднюю

# ДА 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

**Міхась Шыманскі**

# НЕ ПАКІНЬ НАС, ПАМЯЦЬ

*Эсэ*

## I. ГОРКІЯ САЛОДКІЯ ЧАРНІЦЫ

Той дзень спачатку прынёс нам вялікую ўдачу, а значыць, і радасць, потым страшны ўспамін. З роднай сястрой Марыяй пайшлі ў чарніцы, ды спачатку іх не было. Людзі даўно сабралі. І мы паступова забіраліся ў глыбіню лесу, хутка апынуліся каля ўрочышча, дзе кожнае лета радзіла багата чарніц.

### Процьма ягад

Раптам убачылі такое, што ахнулі з радасці:

— Вось дык чарніцы. Іх тут процьма. Набяром ягад столькі, колькі нам трэба, — і дадому.

Ягады паспелі ў сасонніку, і было іх так многа, быццам хтосьці шчодра рассыпаў. У кожнага з нас — вялікі кош, сплецены з лазы. Збіраем чарніцы весела, каштуем іх — ах, якія сакавітыя, якраз паспелі, ды буйныя, з шызаватым налётам. Кусцікі ад цяжару прыгнуліся да самай зямлі. І куды ні зірнём — чарніцы, чарніцы, чарніцы. Не бачым ніводнага следу, ніводнага зломленага кусціка — значыць, мы першыя дабраліся да гэтага месца. Калі б хто-небудзь з нашых вяскоўцаў тут ужо быў — пахваліўся б на ўсе Пешкі і ў сасоннік рушылі б людзі. Такое чарнічнае багацце — грошы ў хату, бо наш мясцовы кааператар Васіль Касевіч прымаў іх столькі, колькі пешкаўцы здавалі. І плаціў добра. Словам, на чарніцах у тыя цяжкія пасляваенныя часы можна было зарабіць больш, чым у калгасе.

### На пагорку

Хутка без перапынку мы набралі ягад столькі, колькі змаглі. Зразумела, вельмі стаміліся, а трэба ж яшчэ ісці дадому, і амаль палова шляху праз лес, ды з двума поўнымі кашамі. Ох, і цяжка нам будзе! Таму вырашылі выбрацца на маляўнічы пагорак і там крыху адпачыць.

---

*Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Полымя» працягвае друкаваць успаміны пісьменніка, ветэрана айчыннай журналістыкі, нашага даўняга аўтара Міхаіла Шыманскага. Ён — дзіця вайны. Узнаўляючы са сваімі бацькамі, іншымі жыхарамі роднай вёскі Пешкі Бярозаўскага раёна многія падзеі, з глыбокім болем, хвалююча распавядае пра перажытае і незабытае ў час страшнай нямецкай акупацыі. Мы павінны ўсе берагчы нашу гістарычную памяць, каб не паўтаралася жахлівае — гэта асабліва важна цяпер, калі столькі небяспечных выклікаў.*

Вось мы і на пагорку. Глядзім навокал і не верым сваім вачам: дык гэта той самы пагорак, дзе аднойчы ў вайну за намі паляваў нямецкі самалёт. Страшнае месца, якое мы хацелі забыць, ды не змаглі. Што ж здарылася?

Тады летам на гэтым пагорку ратаваліся ад немцаў многія вяскоўцы. Мы ўсе вельмі гаравалі: нашу вёску за дзве жахлівыя карныя аперацыі немцы спалілі. Усё нажытае людзьмі прапала. Галодныя, апранутыя ў розныя лахманы, пагарэльцы туліліся на хутарах, якіх было шмат у наваколлі.

Калі фашысты пачалі асабліва лютаваць, наляталі знянацку на вёскі, хапалі і гналі з сабой жыхароў, якія не паспелі ўцячы, нямоглых забівалі на месцы, хаты і ўсе гаспадарчыя пабудовы палілі, тады і на хутарах стала вельмі небяспечна. Таму мужыкі і перасялілі маці з дзецьмі ды нямоглых старых у глыбокі лясны гушчар.

## Глухое ўрочышча

У вайну ўрочышча стала для пешкаўцаў выратавальным месцам. На высокім сухім пагорку мужчыны выкапалі прасторную зямлянку, паставілі некалькі моцных будынкаў. І калі немцы праводзілі аблавы, каб схапіць больш крэпкіх мужыкоў і маладых хлопцаў для прымусовай адпраўкі ў Германію, нашы ратаваліся ва ўрочышчы, дзе можна было спакойна перачакаць небяспеку. Ніякія немцы, паліцаі за ўсю акупацыю сюды ніводнага разу не дабіраліся. Бо ведалі, што назад жывымі могуць і не вярнуцца: у лесе гаспадарылі партызаны.

І мая сястра Марыя, і я добра памяталі ўрочышча. Тыя некалькі дзён — бы ў зялёным раі. Божа мой, як жа тут было ціха, спакойна, утульна, якая чароўная лагода панавала наўкола. Пагорак прывабіў нас незвычайнай прыгажосцю. Пасярэдзіне раслі магутныя разгалістыя волаты-дубы, па краях — высачэзныя сосны, крыху ніжэй — густыя яліны, маўклівыя і загадкавыя. Іншы раз у вершалінах дрэў плыў лёгкі пошум, такі ласкавы, пяшчотны, што лёгка станавілася на душы. У такім прыродным харастве не хацелася думаць, што ідзе вайна.

## Прыемны сюрпрыз

Адзін вясковец, які тут падтрымліваў належны парадак, правёў нас у сасоннік, дзе зямля была густа пакрыта чарнічнікам.

— Вось ягады, і ўсе вашы, — сказаў дзядзька. — Збірайце і ешце, колькі хочаце, я буду разам з вамі.

Гэта быў той самы сасоннік, пра які расказаў на пачатку аповеду. У вайну тут ягад расло не меней, а мо і больш. Як жа дружна накінуліся на іх мы, паўгалодныя пагарэльцы. У дзяцей твары адразу сталі мурзатыя, бо елі ягад шмат.

Паколькі сасоннік займаў даволі вялікую плошчу, тут трапляліся палянкі і поўнасцю адкрытыя сонцу, і пад засенню дрэў. На адкрытых мясцінах чарніцы драбнейшыя, пад дрэвамі — буйныя, але ўсюды паспелі добра, так што самая пара іх збіраць.

Кожны дзень хадзілі нашы жанчыны ў сасоннік.

## Неба здрыганулася

І цяпер, праз многа дзесяцігоддзяў, добра памятаю той дзень, бо жахлівае здарэнне назаўсёды ўрэзалася ў дзіцячую свядомасць. На небе ні хмурынкі. Раптам яно здрыганулася ад нечаканага страшнага гулу. Усё наваколле неяк

дзіка завыла, шматгалосае рэха білася паміж дрэў, кацілася па лесе, адгукалася ўдалечыні і зноў вярталася да нас.

Свет абрынуўся страхам і невядомасцю, мы аслупянелі, бо не разумелі, што адбываецца. І раптам над намі праляцеў самалёт — так нізка, што здавалася: ён вось-вось зачэпіцца за вяршаліны дрэў. Ад дзікага гулу ў нас пазакладала вушы.

— Нямецкі самалёт! — крыкнула жанчына. — Хутчэй уцякайце з пагорка, хавайцеся, дзе можаце!

Мы кінуліся да кустоў, але дабегчы не паспелі, бо самалёт вярнуўся. Так і бачу цяпер: ён вынырнуў з-за дрэў і ляціць проста на мяне. Я падаю на зямлю і, аглушаны, паўзу на край пагорка, да густых маладых ялін. Разумею, што пад імі магу схавацца, але ці дабяруся? Бо самалёт кружыць над пагоркам, і ў небе не сціхае страшны гул, ад якога дрыжыць лес. Хто ведае, з якой мэтай так нечакана з'явіўся гэты самалёт, чаму робіць круг за кругам? А раптам кіне на нас бомбы ці разане з кулямёта...

Нарэшце падпаўзаю да ялін, хаваюся пад іх густымі галінамі, зашываюся ў траву. Баюся паварушыцца, прыслухоўваюся, што адбываецца навокал. У небе ціха, самалёт больш не лятае, а я не магу ачомацца. Дзе ўсе нашы, чаму не чуваць галасоў? Пэўна, я аглух...

## «Дзетачкі, ці вы жывыя?»

Паволі выпаўзаю з-пад ялін, але на пагорак выходзіць баюся. На ім пуста. Усе людзі пахаваліся ў кустах, пад дрэвамі. Там чуюцца спалоханыя галасы, толькі ніхто пакуль не выбіраецца на адкрытае месца.

І раптам адчайныя крыкі, нават плач. Бягуць сюды тыя жанчыны, якія збіралі ў сасонніку чарніцы. Яны таксама чулі і бачылі нямецкі самалёт, але не ведалі, што ён мог нарабіць на пагорку. Таму беглі і крычалі:

— Ой, дзетачкі нашы. Ці вы жывыя?

У жанчын пусты посуд: калі беглі, рассыпалі ўсе сабраныя ягады, ды і не да іх было. Мы ўсе стоўпіліся пад дрэвамі. Жанчыны плачуць, перапалоханыя дзеці туляцца да іх, са страхам пазіраюць на неба, некаторыя закрываюць вачаняты далонямі.

— Во пракляты немец, — перагаворваюцца людзі. — Не можа дабрацца ў гэтае ўрочышча на аўтамабілі, дык самалёт пусціў.

— Гэта для нас небяспечна. Самалёт разведаў, колькі тут сабралася людзей. Вось і чакай бяды.

Жанчыны разгубленыя, страшна перапалоханыя, не ведаюць, што рабіць. Некаторыя цягнуць сваіх дзяцей у кусты, хаваюцца там і не хочуць выбірацца на пагорак — раптам зноў прыляціць нямецкі самалет. Адчайныя стогны, дзіцячы плач...

Добра, што спакойны той мужчына, які прывёў нас у гэтае ўрочышча.

— Жанчынкі, давайце без панікі, — гаворыць. — Можа, нямецкі лётчык і ўбачыў на пагорку людзей, не ўсе ж паспелі схавацца. Ну і што? У гэтую глуш немцы не дабяруцца, партызаны расказваюць, што такога яшчэ ні разу не было. І дарогі сюды ніякай, самі бачыце. Дый пабаяцца паліцаі з немцамі пасунуцца ў такі вялікі лес, каб не нарвацца на партызанскую засаду. Рыхтуйце дзецям абед, будзем чакаць добрых вестак. Вось-вось нашы пагоняць адсюль немцаў.

Крыху прайшоў страх, а трэба ж дзяцей накарміць. Чым? Знайшлося некалькі кавалачкаў хлеба, раздзялілі яго паміж усімі дзецьмі. Паставілі на траву кошык з чарніцамі, усадзілі вакол дзяцей — ешце. І хоць мы былі галодныя, але елі неахвотна. Трывожна прыслухоўваліся, што ў небе, раптам зноў вынырне страшны самалет, пры кожным незнаёмым гуку малыя ўскоквалі з травы і беглі да ялін, кустоўя. І вось дзіўна: нам здавалася, што ў той дзень чарніцы былі горкія…

Дзеці, у тым ліку і я, пасля гэтага жахлівага выпадку доўга баяліся прыгожага ўрочышча.

— Ну хоць сілай цягні туды цябе, ні за што не пойдзеш, — успамінала наша маці Галена Антонаўна. — А лес ты вельмі любіў з самага дзяцінства.

І ўсё ж мне часта пасля вайны сніўся страшны сон: быццам проста на мяне ляціць нямецкі самалёт, я ўцякаю і чамусьці застаюся на месцы.

## Кааператар нас пахваліў

Доўга ў той дзень затрымлівацца на пагорку не хацелася, спяшаліся здаць мясцоваму кааператару свежыя чарніцы. Толькі яшчэ завіталі да крынічкі, з якой бралі ваду ў тыя дні, калі тут ратаваліся ад немцаў. І як жа ўзрадаваліся, калі ўбачылі, што яна па-ранейшаму празрыстая, спакойная, прывабная. Зачэрпнулі па кубку вады, асвяжылі твар і па глытку смакавалі чыстую-чыстую вадзіцу.

Кааператар Васіль Касевіч, калі ўбачыў два нашы вялікія кашы, поўныя ягад, здзівіўся:

— Якія буйныя чарніцы. І свежыя. Дзе вы іх столькі набралі?

Мы расказалі.

— Так глыбока забраліся ў лес і не заблудзіліся. Калі добра ведаеце дарогу да гэтага ўрочышча, дык хадзіце туды ў чарніцы. Я іх прыму да апошняй ягадкі.

Увесь чарнічны сезон радаваў нас з сястрой той сасоннік ва ўрочышчы. Але кожны раз, калі збіралі тут ягады, не маглі пазбавіцца ад страшных успамінаў. І чарніцы на смак часам тут былі гаркаватыя. Так нам здавалася, бо Васіль Касевіч заўсёды іх хваліў і казаў, што незвычайна салодкія...

# 2. НЕВЕРАГОДНЫ ВЫПАДАК

Пра тое, што аднойчы здарылася з нашым бацькам Мікалаем Цімафеевічам, доўга гаварылі і на хутары Буда, і потым ў вёсцы Пешкі. Мне ж яно запомнілася назаўсёды. Бо непасрэдным сведкам небяспечнага здарэння я быў сам. Жахлівая сітуацыя магла скончыцца для бацькі самым страшным, калі б… Але ўсё па парадку.

## Марудлівы бацька

У ціхі летні ранак немцы раптоўна ўварваліся ў Буду зноў жа, як і многа разоў, з вёскі Менявеж. Вельмі ўжо хацелі заспець і схапіць на хутары маладых хлопцаў, каб прымусова пагнаць іх на катаржныя работы ў Германію. Але як часта было, немцы і паліцаі засталіся «з носам». Наш чалавек у Дзеткавічах загадзя папярэдзіў хутарскіх, што мужыкам і хлопцам трэба некалькі сутак

правесці ў лесе, бо немцы і паліцаі плануюць «праверыць» Менявеж і, без сумнення, заскочаць у Буду.

І калі немцы непрыкметна з'явіліся на нашым хутары, дык убачылі тут адных толькі жанчын, дзяцей, нямоглых старых. Праўда, затрымаўся ў Будзе і адзін мужчына — наш бацька.

У каторы раз за вайну падвяла бацьку марудлівасць, якая, скажу прама, была галоўнай рысай яго характару. Колькі ж страху з-за гэтага нацярпелася наша маці Галена Антонаўна і мы, чацвёра дзяцей. Уявіце, паважаныя чытачы, такую сітуацыю: ад нашай вясковай «варты» паступіў трывожны сігнал, што ідуць немцы, усе людзі хто куды: у лес, на балоты, у выкапаныя загадзя ў полі «акопы». Хутчэй-хутчэй ад небяспекі, хто ж ведае, што на гэты раз задумалі бязлітасныя акупанты...

А наш бацька, як любілі казаць пешкаўцы, хоць бы хны. Корпаецца ў хляве, клуні, нешта шукае, і сам не ведае што. Калі маці аж загалосіць ад страху — паволі запрагае ў воз нашу худую кабылку Каштанку. Яна такая ж марудлівая, як і бацька. Мо па сваёй натуры і мо таму, што заўсёды была галодная, і не хапала сіл цягнуць з двара па разбітай дарозе, а то і праз паплавы і лугі воз. Неяк запражэ бацька Каштанку, а потым дастане з кішэні тытунь, кавалак газеты, зробіць самакрутку і, нарэшце, крыкне нам усім, каб збіраліся выязджаць у лес. Можна толькі здзіўляцца, што немцы не схапілі нашу сям'ю, бо падобныя сітуацыі здараліся даволі часта. «Зноў нас Бог пашкадаваў», — кожны раз казала маці.

## Адзін у клуні

Нешта падобнае адбылося і ў той дзень, пра які мой аповед. Сам бацька доўга ўспамінаў неверагодны выпадак, я і перакажу тут яго ўспаміны.

— У тую раніцу я быў у клуні, — распавядаў бацька. — І не чуў, як непрыкметна прыйшлі на хутар немцы. Падыходжу да прыадчыненых варот — і хутчэй убок, за сцяну: каля хаты Ладзіхі стаіць немец. Спінай да мяне, гэта і выратавала ў той момант. Немец быў чымсьці вельмі заняты і не адварочваўся назад.

Я хуценька забраўся ў самы далёкі куток клуні і думаў, што ж рабіць. Заставацца ў клуні нельга, немцы «прачэшуць» увесь хутар, абшнараць кожную сядзібу, хату, клуню, хлеў. Так яны рабілі заўсёды, калі наскоквалі ў Буду. Трэба найхутчэй вылазіць з клуні, паўзком дабірацца да жыта, яно ж зусім блізка. І праз жыта ў лес. Гэта вельмі рызыкоўна: мяне ўбачыць той немец, які стаіць каля хаты Ладзіхі, падумае, што я ўцякаю да партызанаў, і тады...

Вылез з кутка, падышоў да той сцяны клуні, якая ў бок хаты Ладзіхі. Праз шчыліну ў сцяне гляджу, ці стаіць на тым жа месцы немец. Няма яго ля хаты. Зручны момант, каб выбрацца з клуні. Падыходжу да варот, выглядаю ў двор. Ні душы, ніводнага гуку і голасу.

## Што задумалі немцы?

А мо немцы ўжо пайшлі з хутара і мне няма чаго баяцца? Але праганяю ад сябе гэтую думку. Калі б немцы пакінулі хутар, дык хто-небудзь, хоць бы адна жанчына выглянула б з хаты, каб пераканацца, што і як у Будзе. А тут нічога. І ля нашай хаты пуста...

ПАМЯЦЬ

## Дзмітрый Радзівончык

# СВЕТЛЫ ДЗЕНЬ ПАЭТЭСЫ ІРЫНЫ ДАНІК

**Данік (Навуменка) Ірына Мікалаеўна** нарадзілася 15 жніўня 1949 года ў вёсцы Дзергілі Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1968 г. жыла на Данбасе, працавала токарам на Жданаўскім рамонтна-механічным заводзе (Данецкая вобласць), вучылася на вячэрнім аддзяленні Жданаўскага індустрыяльнага тэхнікума. З дзяцінства марыла стаць мастаком і мару ажыццявіла: у 1969 г. паступіла ў Маскоўскі народны ўніверсітэт мастацтваў на факультэт выяўленчага мастацтва. Пісала прозу — апавяданні, эсэ. Вершы пачала пісаць у 1975 г., першы з іх быў надрукаваны ў 1977 г. у Зэльвенскай раённай газеце «Праца», дзе нейкі час працавала карэктарам, лінатыпістам, селькарам. З 1978 г. — загадчыца Дзергілёўскага сельскага клуба. Вершы друкаваліся ў раённай газеце «Праца», у «Гродзенскай праўдзе», «ЛіМе», «Сельскай газеце», газеце «Беларуская ніва», часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Полымя», «Работніца і сялянка», гучалі на рэспубліканскім і абласным радыё і тэлебачанні. Завочна закончыла Гродзенскае культурна-асветніцкае вучылішча (1982—1982 гг.). З 1986 г. жыла ў в. Стральцы Мастоўскага раёна. Працавала дырэктарам Стральцоўскага Дома культуры. Творы друкаваліся ў калектыўных зборніках «Краю мой — Нёман» (Мінск : Маст. літ., 1986), «Каля Нёмана» (Масты, 1994), «Бацька наш Нёман» (Мн., Юнацтва, 2001), «Галасы» (Гродна, 2002—2005), «Наша Лорка» (Слонім, 2002), «Вітражы» (Гродна, 2006). Выдала зборнік вершаў «Мой светлы дзень» (2006). У 2014 годзе стала пераможцай абласнога літаратурнага конкурсу «Гродна — культурная сталіца Беларусі». Памерла 27 красавіка 2018 года.

Я дагэтуль з цеплынёй успамінаю нашы кароткія, але частыя тэлефонныя размовы. Суразмоўніца заўсёды старалася гаварыць толькі па сутнасці, выключна па справе. Але кожны раз не абыходзілася без маленькай разыначкі, дзякуючы якой гутарка раптам пераходзіла са строгай дзелавой у нефармальную сяброўскую. Аднойчы Ірына Мікалаеўна, падняўшы слухаўку, з радасцю сказала: «Нездарма да мяне на акно сёння раніцай прылятаў верабейка. Я адразу зразумела, што мне хутка будзе тэлефанаваць Дзмітрый Мікалаевіч...» Я адчуў, што, кажучы гэта, жанчына ўсміхаецца...

Паэзія Ірыны Данік, на жаль, мала вядомая. У сілу сваёй прыроднай сціпласці, інтэлігентнай стрыманасці таленавітая беларуская паэтэса не старалася быць навідавоку. Адзіны зборнік «Мой светлы дзень» (2006), удзел у калектыўных праектах, некалькі публічных выступленняў… Не шмат…

І кожны з нас на свеце — адзінокі,
Калі гады настойліва плывуць.
Стаіць ля дома поўдзень мой высокі.
А дні ідуць. Куды яны ідуць?

*(«Мой светлы дзень»)*

Верш пачынаецца са злучніка «і». Гэта азначае, што складаны ўнутраны маналог адбываўся задоўга да прынятага рашэння выказацца ўголас. Чытачу паэтэса адкрыла толькі частку ідэйнай канвы, частку свайго глыбокага роздуму пра сэнс

жыцця, сучасны свет і месца чалавека ў ім. Таму пачатак твора выглядае як бы сярэдзінай выказвання. Лірычная гераіня Ірыны Данік згаджаецца з прызнаннем татальнай адзіноты ўсіх, хто прыходзіць у гэты свет, і прапануе нам самастойную працу — паспрабаваць зразумець сімволіку створаных яе фантазіяй вобразаў. Загадкі, таямнічая недаказанасць невыпадковыя. Яны накіраваны ў вечнасць, у пазачасавае рэчышча, куды ідуць, па вялікім рахунку, усе нашы дні і гады. «Стаіць ля дома поўдзень мой высокі»… Што гэта за вобраз? І чаму галоўную падзею ў сваім літаратурным жыцці, першы і адзіны зборнік, аўтарка назвала менавіта так — «Мой светлы дзень»? Дом для чалавека — прытулак ад жыццёвых бур, прыстанішча, стабільнасць, пункт адліку. Для жанчыны дом — сакральная прастора, сакральная каштоўнасць. Для жанчыны-паэтэсы дом — нешта нашмат большае: гэта і радзіма, і калыска, і месца пад сонцам. А ці шмат сонца было ў жыцці гэтай жанчыны? Ірына Мікалаеўна Данік была вельмі светлым і жыццярадасным чалавекам. Але гэтае святло душы, народная непасрэднасць паэтэсы не перадаліся складанаму, поўнаму трывог, сумневаў, блуканняў унутранаму космасу яе лірычнай гераіні. Пасля прачытання зборніка і іншых падборак вершаў гэтага аўтара становіцца зразумелым, што *светлы дзень* для паэтэсы — гэта мара аб сусветнай гармоніі, скрыжаванні зямных і нябесных шляхоў, стан нястрымнага палёту чалавечай душы, мэту якога кожны разумее па-свойму.



**Ірына Данік**

Захацелася прапасці
У палях зялёных,
Каб да радасці прыпасці,
Да узгоркаў родных,
Да маленькіх успамінаў,
Што шукаюць волі,
І пачуць матывы гімнаў
У зялёным полі.

*(«Радасць»)*

Лірычная гераіня імкнецца да ўцёкаў. Чым жа тлумачыцца гэты эскапізм, жаданне збегчы ад рэчаіснасці ў іншы, цудоўны свет і нават там «прапасці»? Можа быць — недахопам нейкіх важных адчуванняў, звязаных з родным домам?

Сцелецца восень салодкая
Дымам ад спаленых мар…
Радасць узыдзе кароткая,
Аж усміхаецца твар.

*(«Асенняе»)*